Пакінуць трывалы код ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

25 САКАВІКА — ГАЙНАЎКА ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 14 (2499) Год XLIX | Беласток, 4 красавіка 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Бел-чырвона-белыя ружы (з такой жа стужкай) Святлане Зелянкоўскай дарылі беларускія радныя Міхась Андрасюк, Яўген Сачко і Яўген Янчук

Ёсць беларускае кіно

— Вы вельмі добры пасол Беларусі, — заявіла жанчына з публікі, звяртаючыся да Святланы Зелянкоўскай у час адкрыцця „Дзён беларускага кіно", пасля дэманстрацыі фільма „Анастасія Слуцкая".

— Першы крок зроблены і мы павінны рухацца ў добрай справе. Трэба падтрымліваць прадукцыю беларускіх гістарычных фільмаў і адкрываць у іх нас, як беларусаў. Калі будзем расказваць пра сябе шчыра і прафесійна, тады можам спадзявацца поспехаў на розных фестывалях і рынках, — заявіла Святлана Зелянкоўская.

* * *

Дарослыя ды дзеці і моладзь з настаўнікамі з 22 па 26 сакавіка прыходзілі ў Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы, каб паглядзець беларускія фільмы. Мнагалюдная публіка прыйшла на адкрыццё мерапрыемства „Дні беларускага кіно", якое адбылося ў музеі 21 сакавіка. Галоўнымі падзеямі ў час адкрыцця былі прэзентацыя фільма „Анастасія Слуцкая" і сустрэча з выканаўцам галоўнай ролі, актрысай Святланай Зелянкоўскай.

Многія сабраныя падыходзілі да актрысы з віншаваннямі і кветкамі. Кіраўнікі Самаўрадавага форуму з Гайнаўкі Міхась Андрасюк, Яўген Сачко і Яўген Янчук, якія толькі што вярнуліся са святкавання 25 Сакавіка, падарылі актрысе букет з белых і чырвоных ружаў, перавязаных бел-чырвона-белай стужкай, сімвалам незалежнасці Беларусі.

Гайнаўская публіка станоўча ацаніла ігру акцёраў, падбор касцюмаў і падрыхтоўку карціны з вялікай колькасцю статыстаў у фільме „Анастасія Слуцкая". Сабраныя здзіўляліся, што фільм абышоўся сумай толькі 1 мільёна долараў.

— Мільён долараў для Беларусі — гэта вельмі вялікія грошы. У нас танная рабочая сіла і паслугі. Французскі прадзюсер сказаў, што цана ўсіх касцюмаў у яго краіне перавысіла б бюджэт фільма, — патлумачыў рэжысёр Юрый Ялхоў. — Усе касцюмы ў нас арыгінальныя і шылі іх уручную энтузіясты і да гэтага амаль бясплатна.

Фільм „Анастасія Слуцкая" атрымаў шэсць прэстыжных узнагарод на міжнародных фестывалях. Паказваўся ён у Беларусі, у многіх мясцовасцях Расіі і Украіны. Аднак амаль усюды — на рускай мове, на якой узнік арыгінал. Беларускамоўная і англійскамоўная копіі былі створаны пазней. Гайнавяне пыталі, чаму так мала фільмаў узнікае на беларускай мове і заклікалі больш увагі адвесці прадукцыі беларускамоўных стужак. Рэжысёр Юрый Ялхоў тлумачыў, што стужка ўзнікла на рускай мове па камерцыйных прычынах — дзеля лепшага распаўсюджвання на рынках краін былога Савецкага Саюза.

— Я вельмі рады, што ўзнікаюць беларускія гістарычныя фільмы. Можна заўважыць тэхнічныя недахопы, але першы крок зроблены. На фільмах, што прывезены ў Гайнаўку, захапляе мяне добрая ігра акцёраў, перад усім Святланы Зелянкоўскай. Шкада толькі, што стужкі, якія паказваюцца для масавай публікі ў Беларусі, выпушчаны на рускай мове, — сказаў настаўнік гісторыі з Гайнаўкі Яўген Янчук.

* * *

Дакументальныя фільмы Рышарда Ясінскага захапілі гайнавян сваёй прастатой і незвычайнасцю. На прыкладзе простых людзей паказаў ён лепшыя рысы характару беларусаў. Цікавым дакументальным фільмам аказалася стужка „Душа не падарожніца". Рэжысёр арыгінальна паказаў у ёй творчы шлях беларускага эмігранта Барыса Кіта. Быў ён адным са стваральнікаў паліва, на якім амерыканцы паляцелі на Месяц. У другім фільме „500 гадоў памяці" аўтар вельмі цікава паказвае чалавека, які адшукаў карані свайго роду, пачынаючы з 1539 года. Фільм-партрэт зроблены на фоне палескай вёскі, якой лёсы пераплятаюцца з лёсамі героя.

— Калі я сустракаўся са звычайнымі людзьмі, бачыў іх лёс, якога не прыдумае пісьменнік для мастацкіх сюжэтаў. Вельмі цікавая душа чалавека і яго розум. Калі мы працуем у „Беларусьфільме", дык павінны выконваць стужкі на беларускай мове, — сказаў Рышард Ясінскі.

— Я задаволена, што прывезлі беларускія фільмы ў Гайнаўку, але якасць некаторых стужак дрэнная. У час прэзентацыі старога фільма „Хрыстос прызямліўся ў Гародні" момантамі не было чуваць, што гавораць акцёры. Хаця гэты „палкоўнік" праляжаў на паліцы шмат гадоў, то я мела ўражанне, што ён яшчэ парэзаны ў некаторых месцах, — сказала Іаланта Грыгарук з Гайнаўкі. Некаторыя копіі старэйшых фільмаў таксама аказаліся нізкаякаснымі. Многіх гайнавян здзівіла, а нават усхвалявала, што біяграфічны фільм пра польскую пісьменніцу, якая жыла на беларускіх землях — Элізу Ажэшка, прэзентаваўся на рускай мове.

Для дзяцей, што масава прыходзілі ў музей, падабаліся мультыплікацыйныя фільмы. Сярод іх былі фестывальныя, філасофскія стужкі і фільмы для дзяцей рознага ўзросту. Для дзетак спадабалася сустрэча з рэжысёрам мультфільмаў Аленай Туравай, якая расказвала як узнікаюць стужкі для наймалодшых.

— Бачым, што беларускія фільмы карыстаюцца вялікім зацікаўленнем і таму плануем развіваць знаёмства з імі ў будучыні, — заявіў дырэктар Беларускага музея Ян Карпюк — арганізатар мерапрыемства. Адбывалася яно пад ганаровым патранатам пасла РБ у Польшчы Паўла Латушкі, па ініцыятыве якога арганізаваліся Дні беларускага кіно.

Аляксей Мароз

Закаханыя ў Пуціна ☞ 2

Віктар Сазонаў

Беларусам даўно зразумела, што хто б не прыйшоў да ўлады ў Крамлі, сітуацыя ў бліжэйшы час кардынальным чынам не зменіцца. Наша галоўная задача — адмежавацца ад палітычнай ідэалогіі ўсходняга суседа...

Косава без сербаў ☞ 2

Яўген Мірановіч

Калі вясной 2000 года пачыналася агрэсія амерыканцаў і іх натаўскіх саюзнікаў супраць Югаславіі, міністр па справах бяспекі ў канцылярыі прэзідэнта Польшчы Марэк Сівец заявіў па радыё: „Bomby, spadające na Belgrad, są to bomby niosące pokój"...

На мяжы з Беларуссю ☞ 4

Ганна Кандрацюк

Па дарозе ў Бабікі я таксама думала пра „Лявоніху". Менавіта, тут на Сакольшчыне я пачула найпрыгажэйшы ўспамін пра гэты легендарны беларускі гурт. Як адзін яго паклоннік закахаўся ў спявачку. Пасля канцэрта, калі „Лявоніха" рушыла ў дарогу, ён сеў на матацыкл і іх следам доўга яшчэ ехаў за аўтобусам...

Які сэнс? ☞ 5

Мацей Халадоўскі

У іншай з мэт пералічваецца ў чарговы раз як важны „фактар развою ваяводства" супрацоўніцтва памежных рэгіёнаў з Беларуссю і Літвой, а сам Беласток мае быць „сувязным паміж краінамі ўсходняй і заходняй Еўропы". Зноў не пералічваюцца ніякія планаваныя, канкрэтныя мерапрыемствы на гэты конт. Рэшта апісваецца як „узмацнянне супрацоўніцтва", „ушчыльнянне сувязей" і г.д.

Наша Нараўка ☞ 9

Н. Раманчук, С. Дрозд

У Нараўцы нарадзіліся і жылі Тамара Саланевіч і Аляксандр Валкавыцкі, якім блізкія былі справы беларускага народа. У 1972 годзе Пачатковай школе прысвоілі імя Аляксандра Валкавыцкага, а ў 2000 годзе Публічнай гімназіі — імя Тамары Саланевіч...

Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

Упершыню ў гісторыі Беларусь узяла ўдзел у алімпіядах як незалежная краіна. Гульні для беларусаў выдаліся не надта ўдалымі...

Увага! Праз тыдзень...

... святочны нумар „Нівы", а ў ім валачобны дадатак у чатыры старонкі. Веснавая мода на „Ніву" працягваецца. Падкажыце іншым.

Бі-бі-сі. Беластоцкі беларускі слоўнік

А — Актывіст

Актывіст — той хто належыць да актыву. Актыў — найбольш дзейная частка калектыву або арганізацыі.

У нашым грамадстве актывіст успрымаецца насцярожана, бо наогул звычайнага чалавека да чагосьці ён прымушае, а ў самым лепшым выпадку разбурае спакой і добрае самаадчуванне.

Дрэнную славу актывіст прыжыў на працягу дзесяцігоддзяў. Упершыню аб'явіўся ён у саракавыя гады. Назіраліся тады дзве, пакаленнева розныя групы актывістаў. Першая — студэнты. Асноўная мэта студэнтаў-актывістаў — забяспечыць горад, а перш за ўсё рабочы клас у прадукты штодзённага харчавання. На практыцы ажыццяўлялася гэтая мэта больш-менш так: у вольны ад адукацыйных заняткаў час студэнт-актывіст апранае белую кашулю, чырвоны гальштук, загружаецца ў кузаў грузавіка і расспяваным калектывам бярэ напрамак на раней прадбачаную вёску. З'ехаўшы на мужыцкі панадворак пачынае добрым словам пераконваць гаспадара ў тым, як важнай справай з'яўляецца зараз сялянска-рабочы саюз, а наймацнейшым і самым стратэгічным вузлом, што завяршае гэтае сяброўства — мяса, хлеб і воўна.

Мужыцкі клас у пяцідзесятыя гады быў малаадукаваны, па гэтай прычыне ягоная грамадская свядомасць і пачуццё адказнасці за дзяржаву, у канфрантацыі з эгаістычнымі мэтамі стаялі на пройгранай пазіцыі. Выяўляўся той эгаізм яркімі фарбамі, калі апошні мяшок аўса або жыта, прыдбаны для вясновай сяўбы, даводзілася ахвяраваць галоднаму гораду.

Другая група актывістаў — актывісты штатныя. Свае кабінеты адваявалі яны раней, на ўсялякіх франтах — партызанскіх, ваенна-вайсковых, але таксама і гарланістых, партыйна-ідэалагічных мітынгах. Засеўшы пасты сакратароў і старшынь прафсаюзаў, цягам будзённага тыдня яны абмяркоўвалі выхадныя дні, а дакладна — як наладзіць работніцкай грамадзе карысны суботне-нядзельны адпачынак. Так нараджаліся суботнікі — добраахвотніцкія подзвігі пад чуйным наглядам прафесійных актывістаў. Яшчэ і зараз не ўсе еўрапейскія краіны адмовіліся ад гэтага шляху да лепшай будучыні — самага таннага і самага расспяванага, бо — з думкай аб маладых чытачах трэба прыпомніць

— праходзілі тыя суботнікі таксама ж з абавязковай песняй на вуснах.

У пяцідзесятыя гады масава з'явіўся таксама беларускі актывіст: малады чалавек, які не так даўно пасяліўся ў Беластоку, прыдбаў сякую-такую адукацыю і зараз, па выхадных ён вяртаўся на вёску замацоўваць там беларускую ідэю. Для здзяйснення гэтай місіі не прадбачваўся ніякі дзяржаўны транспарт. Беларускі актывіст быў такім чынам прысуджаны на сваю прыватную хітрасць, вынаходлівасць і моцныя ногі. Ён наогул карыстаўся рэйсавымі аўтобусамі і цягнікамі, а дыстанцыю між паўстанкам а ўзятай на прыцэл вёскай пераадольваў пехатою, збіваючы пры нагодзе крысом пінжака расу з жытніх загонаў.

І зноўку, зважаючы на маладое пакаленне, трэба прыпомніць, што беларуская вёска на Беласточчыне была ў той час дашчэнту беларуская і прапанаваныя актывістамі ідэі ўспрымала без залішніх пратэстаў.

У Беластоку беларускасць у той час не замацоўвалася, а прынамсі не адводзілася для яе значнейшая ўвага. Прычыны такое сітуацыі ўсебакова абмеркаваліся і гісторыкамі, і сацыёлагамі, але, на маю думку, у асноўным вінаваты тут наш беларускі рацыяналізм і прагматызм, які кожнаму прадмету, як і кожнай ідэі вызначае канкрэтнае, вопытам пакаленняў названае месца.

Зараз на Беласточчыне беларускіх актывістаў няшмат і — калі не памыляюся — ні адзін не выгадаваўся ў Беластоку. У асноўным — ёсць такія галасы — віна ў фінансавай мізэрнасці. Кажуць — сучаснага беларускага актывіста фарміруюць гранты, дача і як мінімум раз у год двухтыднёвы адпачынак на Багамскіх астравах. І — вельмі важнае — легкавая машына. Без яе ніякі малады актывіст у глыбінку не рухнецца. З-за такой прычыны непарушанай стаіць раса на жытніх загонах. Вядома, толькі там, дзе не паспелі тыя загоны пераўтварыцца ў аблогу.

Міхась Андрасюк

Дзень закаханых у Пуціна

Падчас нядаўняй „газавай вайны" паміж Беларуссю і Расіяй, адзін з каментатараў Беларускага тэлебачання ў аўтарскай праграме вельмі трапна заўважыў, што 14 лютага — дзень закаханых, а 14 сакавіка — дзень закаханых у Пуціна. Кампанія па выбарах прэзідэнта Расійскай Федэрацыі цалкам пацвердзіла яго словы. Расія — усходні сусед Беларусі. Гэта краіна ніяк не можа пагадзіцца з тым, што Беларусь — незалежная дзяржава і ўвесь час спрабуе навязваць нам сваю волю. Таму беларусам неабыякава, што адбываецца на Усходзе і якое кіраўніцтва прыйдзе да ўлады.

За гады кіравання Пуціна агрэсіўнасць расійскага грамадства неверагодна ўзбуйнела. Яе зараз можна параўнаць толькі са сляпой і бяздумнай агрэсіўнасцю ісламскіх тэрарыстаў. Расійскае грамадства хоча пасылаць сваіх дзяцей на смерць і забойствы, дзеля задавальнення сваіх эгаістычных вялікадзяржаўных жаданняў.

Аніводзін з прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта Расіі не толькі не збудаваў сваю кампанію на антываеннай тэматыцы, але і не захацеў увогуле яе агучваць. Іх больш цікавілі войны, якія вядзе ЗША, чым тая, дзе паміраюць іхныя грамадзяне. А змаганне паміж сабой, па іхных жа сцвярджэннях, яны вялі толькі за другое месца. У тым, што выйграе Пуцін, не сумняваліся нават кандыдаты, якія бралі ўдзел у выбарах. Пуціну ўсімі расійскімі палітычнымі структурамі, а таксама грамадствам гэтай краіны дадзены карт-бланш на працяг той палітыкі, якую ён праводзіў, на канчатковае ўсталяванне агрэсіўнай і нават дыктатарскай ідэалогіі.

На дзяржаўным канале Беларускага тэлебачання адна з расійскіх грамадзянак, якая выйшла замуж за беларуса, жыве ў Беларусі, але грамадзянства змяняць не хоча, сказала, што беларусы адрозніваюцца ад расійцаў характарам. Маўляў, беларусы больш меланхалічныя. Гэтага цяжка не заўважыць. У параўнанні з агрэсіўнасцю, якая наўмысна, мэтава і свядома выхоўваецца ў расійскім грамадстве, бальшыня народаў свету — меланхолікі. Толькі да чаго вядзе такая палітыка? Гісторыя вучыць, што да новых войнаў.

Як жа ў такой сітуацыі паводзіцца беларусам і ўкраінцам? Менавіта на іх землі цяпер скіраваныя пагляды расійскіх уладных структураў і фінансавых алігархаў. Статус „вялікай дзяржавы" патрабуе ад расійскага кіраўніцтва „поспехаў" на заходнім кірунку. Выбары на Украіне турбуюць Расію больш, чым свае. Са сваімі ўсё зразумела. А што рабіць, калі на Украіне выйграюць украінцы, а ў Беларусі — беларусы?! На такі варыянт, думаю, Крэмль ужо мае распрацаваны план дзеянняў. Бо без кіравання гэтымі дзяржавамі ў Масквы цалкам развальваецца ідэя „ўсходнеславянскага адзінства", і, адпаведна, не набываецца статус вялікай дзяржавы, якога так бракуе сённяшняму расійскаму выбаршчыку. І ці ёсць хоць адзін прадстаўнік, хоць адной палітычнай сілы ў Расіі, які хоць паспрабуе змяніць ментальнасць свайго грамадства.

Беларусам даўно зразумела, што хто б не прыйшоў да ўлады ў Крамлі, сітуацыя ў бліжэйшы час кардынальным чынам не зменіцца. Наша галоўная задача — адмежавацца ад палітычнай ідэалогіі ўсходняга суседа. Саюзныя дамовы і агульная эканамічная прастора з гэтай краінай — гэта прастора для яе і дамовы на сваю згубу. Уся гісторыя беларуска-расійскіх дачыненняў пацвярджае гэта.

Расійскія грамадзяне, якія жывуць у Беларусі, узялі вельмі актыўны ўдзел у выбарах. Беларускае тэлебачанне паказала доўгія чэргі да выбарчых участкаў. Зразумела, што пераважная большасць галасавала за Пуціна. Іх чалавечае жаданне жыць без межаў са сваёй этнічнай радзімай цалкам вытлумачальнае. Як і звычайная абывацельская лянота зазірнуць далей уласнага носа і падумаць, да чаго палітыка Пуціна ўрэшце давядзе. Невядомыя беларускія актывісты паспрабавалі ім гэта давесці. У Гродне, на стэндзе мясцовага гарадскога дома культуры, дзе праходзіла галасаванне, навокал былі расклеены ўлёткі, якія тлумачылі, хто такі Пуцін і да чаго давядзе ягонае кіраванне Расіяй. Але ахоўнікі парадку паспяшаліся хуценька іх паздіраць. Хіба вырашылі, што не справа беларусаў павучаць „старэйшага брата". І нават давесці да таго сваю думку нельга. Маўляў, не трэба расійскаму выбаршчыку ў Беларусі ведаць пра Пуціна больш, чым расійскаму выбаршчыку ў самой Расіі.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Косава без сербаў

Для сербаў Косава было тым, чым для палякаў Вялікапольшча. Там пачыналася сербская дзяржаўнасць, там нараджалася сербская гісторыя. На гэтай зямлі ператрывалі яны стагоддзі войнаў з Візантыяй, турэцкую няволю, італьянска-нямецкую акупацыю падчас II сусветнай вайны.

Пасля вымушанага падзелу Югаславіі, амерыканцы, выкарыстоўваючы албанскую мафію, справакавалі ўнутраны канфлікт. Косаўскія мусульмане паднялі паўстанне супраць сербскай дзяржаўнасці, даючы прэтэкст амерыканска-натаўскай арміі для агрэсіі на гэтую краіну. Некалькі месяцаў амерыканская авіяцыя раўняла з зямлёю сербскія гарады, фабрыкі, электрастанцыі. Сербія капітулявала. Была вымушана забраць свае войскі з Косава. Іх месца занялі натаўскія вайскова-паліцыйныя фарміраванні.

Пад апекай натаўскіх войскаў албанцы знішчылі частку сербаў, а большасць выгналі з гэтай правінцыі. Косаўскімі албанцамі была спалена большасць цэркваў. Некаторыя храмы былі пабудаваны яшчэ ў XIII стагоддзі. Г.зв. цывілізаваны свет прыглядаўся албанскім чысткам з вялікім зразуменнем. У Косаве асталося пару тысяч сербаў, затрыманых натаўскімі войскамі, хіба толькі дзеля таго, каб палітыкі маглі даказаць, што стрымалі этнічныя чысткі. Вайна супраць Сербіі пачыналася менавіта пад такім лозунгам. Пасля рукамі албанцаў былі праведзены сапраўдныя этнічныя чысткі, але гэтага не заўважалі нават „незалежныя сродкі масавай інфармацыі" кшталту „Выбарчай газеты".

Калі вясной 2000 года пачыналася агрэсія амерыканцаў і іх натаўскіх саюзнікаў супраць Югаславіі, міністр па справах бяспекі ў канцылярыі прэзідэнта Польшчы Марэк Сівец заявіў па радыё: „Bomby, spadające na Belgrad, są to bomby niosące pokój". Свяціла польскай журналістыкі Вальдэмар Мілевіч кожнага дня паказваў рэпартажы, дзе абавязкова экспанаваўся плач албанскіх дзяцей. Параненыя натаўскімі бомбамі сербскія дзеці ніколі не адчувалі болю, а бацькі забітых не вырывалі сабе валасоў ад роспачы. Іаланта Пянькоўская расказвала ў тэлебачанні пра гэтую вайну як пра чарговую частку „Уладара персценяў". Ваенная прапаганда паказвала свет чорна-белы: добрых албанцаў, якім трэба было дапамагчы і злачынных сербаў, якім трэба было кідаць бомбы пад вокны. Польшча стала актыўным удзельнікам гэтай вайны, хаця Сербія не дала палякам ніякай падставы нават для прапагандысцкай агрэсіі.

Два гады пасля, падбадзёраныя поспехам у этнічных чыстках у Косаве, албанцы прабавалі падчысціць яшчэ і Македонію, але ўлады гэтай краіны загадзя аб'явілі, што хочуць быць адданымі саюзнікамі Амерыкі. Албанскія банды хутка былі абяззброены. Некаторыя „незалежныя" журналісты пачалі нават сумнявацца ў сэнсе вайны супраць Югаславіі.

У палове сакавіка гэтага года косаўскія албанцы фактычна пазбыліся апошніх сербаў з гэтай правінцыі. Апошняя хваля этнічных чыстак прайшла вельмі хутка. Ніякіх пратэстаў „цывілізаванага свету" не было і гэтым разам. Паводле галоўнага інфармацыйнага сервісу польскага тэлебачання ўсяму вінаватыя сербы. Як зачытала Іаланта Пянькоўская 21 сакавіка ў праграме „Ведамасці", з прычыны сербаў утапілася двух албанскіх хлопцаў. Цалкам апраўданы быў затым гнеў албанскага люду. Косава стала чыстай, аднаэтнічнай краінай. Прапаганда яшчэ раз паказала як малаважнай з'яўляюцца праўда, справядлівасць, сумленнасць.

Яўген Міранові́ч

Памятаю, як быў здзіўлены Адам Мальдзіс, у той час студэнт журналістыкі, што я — беларус...

Пакінуць трывалы код

Васіль Чачуга са сваёй унучкай Адай у родных мясцінах

— Спадар прафесар, даўно Вы наведалі свае родныя Плюцічы?

— Даўно. Апошні раз тры гады таму ў дарозе на Грабарку. Зараз бацькоўская хата стаіць пустая. Паўміралі мае бацькі, ды і мы з жонкай па прычынах здароўя, хаця і маем машыну, не можам туды даехаць. Доўгая дарога да свайго роднага.

— А як клікалі Вас тады ў дзяцінстве на вясковай вуліцы?

— Васіль Юркуў або Мэдведюў. Мой дзед быў вельмі моцны. Калі будавалі чыгунку Брэст — Беласток, то каб занесці адну рэйку, патрэбны былі чатыры асобы, а мой дзед патрапіў цягнуць яе сам. Такі быў дужака, але тады людзі былі моцныя, дзейнічаў натуральны адбор.

— Вам давялося яшчэ спазнаць, што такое голад...

— Яшчэ так, але не толькі мне, але і іншым плюціцкім людзям санацыйная Польшча не была роднай маці. Памятаю, не раз, калі ішоў з-над Нарвы дахаты, у галаве з голаду аж кружылася. Каб не ўпасці, я лічыў, колькі мне засталося крокаў у хату. І вытрымоўваў. Але быць бедным не абазначае жыць без годнасці. Памятаю, у 1938 г. мой сябра на школьным будынку напісаў: „Nie chcemy szkoły polskiej, ale białoruskiej". Польская паліцыя ўсю вёску цягала на допыты ў Бельск. Хоць мы і ведалі, хто напісаў, але ніхто не прызнаўся. Бачыце, якая была тады беларуская салідарнасць, гаворачы сённяшнімі словамі.

— Салідарнасць і зацятасць патрэбныя ў жыцці?

— Безумоўна. Без гэтага чалавек не быў бы тым, кім ёсць сёння.

— А Вашы сябры-аднавяскоўцы таксама пайшлі заваёўваць свет...

— Генеральна так. Лёс майго пакалення выглядае як першы такі масавы палёт птушак з беларускіх вёсак за навукай, за працай, у польскую грамадскасць. Не заўсёды быў аднак гэта вырай. Але людзі дабіліся поспехаў. Мае сябры з вёскі так, як і я, сталі навукоўцамі, вайскоўцамі, міліцыянтамі. Раз'ехаліся па ўсёй краіне.

— Калі, спадар прафесар, і Вы паляцелі са свайго дому і куды?

— У 1947 г. бацька завёз мяне ў Беласток. Мне трэба было і вучыцца, і працаваць. Быў я паўсіратою і мусіў сам зарабляць на сваю адукацыю. Працуючы ў кураторыі асветы, вучыўся ў вячэрняй школе. Рабіў па два класы ў адзін год. Мае поспехі заўважыў тадышні куратар Лойка і ў 1951 г. запытаўся, ці не хацеў бы я паехаць вучыцца ў Беларусь, у Мінскі універсітэт.

— І Вы скарысталіся гэтай прапановай?

— Ясна. Паступіў на біялогію, таму што механізмы функцыянавання прыроды мяне вельмі цікавілі. Выхаваны над ракою Нарвай, дзе ў дзяцінстве я купаўся і прыглядаўся ўсяму цікаваму, я інтуітыўна адчуваў, што яны былі мне блізкія. Сваё далейшае жыццё я прысвяціў гідрабіялогіі. Ну што ж, прывабіла і захапіла мяне вада як месца народзін жыцця.

— Ці ёсць можа другая навука, якой маглі б Вы быць так адданым?

— Здзіўлю Вас, але я меў намер паступіць і на гісторыю. І не пакідаю чытаць гістарычныя кніжкі па сённяшні дзень. На маіх паліцах адводжу ім такое самае важнае месца, як і біялогіі. Асабліва цікавіць мяне рэгіянальная гісторыя. Зараз выяўлю адзін сакрэт, пра які даведаецца ў гэты момант і мая жонка Ада (Ада Чачуга — шматгадовая журналістка нашай газеты). Распачаў пісаць успаміны пра сваё дзяцінства і маю вёску.

— Але вернемся яшчэ ў Мінск, у студэнцкія гады...

— Вучыўся я там з 1951 па 1956 год. На працягу пяці гадоў па ўсіх прадметах на экзаменах атрымліваў выключна пяцёркі, але здарылася і адна чацвёрка. А чацвёрка, вядома, выпала праз жанчыну, маю жонку Аду, якая так патрапіла заваражыць мяне... Будучы студэнтам, удалося мне пабачыць такую прыгажосць прыроды ў былым Савецкім Саюзе, што будучы прафесарам Медыцынскай акадэміі ў Беластоку, не раз ездзіў туды з сям'ёй адпачываць і працаваць навукова.

— Зараз адчуваецца вялікая настальгія ў Вашым голасе. Не хацелі Вы там застацца працаваць навуковым супрацоўнікам?

— Была такая прапанова з боку ўладаў універсітэта, але прыйшлі падзеі 1956 года і польскае пасольства ў Маскве загадала з'ехаць назад у Польшчу ўсім нам, студэнтам — грамадзянам Польшчы. У маім архіве захоўваецца пісьмо ад кафедры біялогіі з просьбай застацца. Добра, што жонку з Беларусі ўжо тады дазволілі прывезці, бо на год раней, не даючы згоды на супольны выезд, разбілі вялікае каханне аднаго знаёмага. Такі быў час.

— А як Вас успрымалі ў Беларусі тадышнія ўлады і студэнты — як беларусаў з Польшчы, ці як палякаў?

— Як палякаў. Не разумелі нічога. Або не хацелі. Памятаю, як беручы тады ў мяне інтэрв'ю, быў здзіўлены Адам Мальдзіс, у той час студэнт журналістыкі, калі даведаўся пра тое, што я — беларус.

— З Вашага аповеду вынікае, што ў Беларусі тады вучылася значная група беларускіх дзяўчат і хлопцаў з Беласточчыны?

— Так, была цэлая грамада. Памятаю, Валодзя Юзвюк быў на геаграфіі, Мікола Тарасевіч — на хіміі, Зося Грыц з Гайнаўкі — на беларускай мове і там выйшла замуж, Сцяпан Хвашчэўскі — на фізіцы. Штудзіраваў тады ў Мінску беларускую філалогію і сённяшні архіепіскап Лодзінска-Познанскі Сіман (*інтэрв'ю з ім праз тыдзень у святочнай „Ніве"*), і Мікола Гайдук, і Пётр Чарнякевіч. Прыпамінаю сабе лёс Аляксандра Семенюка — географа, якога пасля вяртання ў Польшчу з вучобы размеркавалі на працу ў Пілу. Не вытрымаў там хлопец у польскім моры, уцёк назад у Савецкую Беларусь разам з жонкай і дзецьмі.

— Спадар прафесар, Вам больш пашанцавала з размеркаваннем на працу?

— Паехаў па размеркаванне ў Міністэрства асветы, а тадышняя пані віцэ-міністр Яўгенія Красоўская (сама родам з Віленшчыны), паглядзеўшы мой дыплом, сказала: з такімі ацэнкамі ў вёску не паедзеш. Пабачыўшы, адкуль я родам, накіравала мяне на адзінае свабоднае месца на Кафедры біялогіі Медыцынскай акадэміі ў Беластоку, дзе я трапіў пад навуковыя крылы прафесара Вітальда Славінскага, дарэчы, таксама віленчука. Такім чынам, мне пашанцавала працаваць на сваёй Бацькаўшчыне з карысцю для развіцця навукі і прамоцыі Беласточчыны ва ўсім свеце.

— Безумоўна, Вы пакінулі трывалы код. Дзякуем.

Гутарыў Яўген Вапа

ВАСІЛЬ ЧАЧУГА — прафесар, замежны сябра Беларускай Акадэміі Навук з 24 сакавіка 1995 г. і Нью-Йоркскай — з 24 верасня 1981 г. Аўтар звыш 600 самастойна апублікаваных прац на ўсіх кантынентах. Друкаваўся ў ЗША (дарэчы, у прэстыжным Гарвардскім універсітэце, быў таксама сааўтарам падручніка па біялогіі для амерыканскіх універсітэтаў, выдадзенага на Фларыдзе), у Англіі, Італіі, Францыі, Японіі, Ізраілі, Бразіліі, Кітаі, Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, Швецыі, Нарвегіі, Ісландыі. Ад 1968 года яго біяграфічная нотка была змешчана ў амаль трыццаці амерыканскіх, англійскіх і індыйскіх энцыклапедыях (WORLD WHO'S WHO IN SCIENCE — FROM ANTIQUITY TO THE PRESENT, INTERNATIONAL BOOK OF HONOR, WHO'S WHO IN THE WORLD і інш.). У 2003 годзе ўнесены ў Амерыканскім біяграфічным слоўніку ў спісак 2000 найбольш заслужаных для навукі вучоных свету і ўзнагароджаны залатым медалём AMERICAN MEDAL OF HONOR. Да 90-х гадоў — старшыня Беластоцкага навуковага таварыства, у рамках якога выдаў чатыры першыя кніжкі айца Рыгора Сасны.

Вучыцца на чужых памылках

У Мадрыдзе ў час тэракту на чыгунцы загінула шмат людзей. Разумны іспанскі народ і ўрад яшчэ раней асцярожна ставіліся да ірацкага канфлікту і паслалі ў Ірак адносна невялікія ваенныя сілы наводзіць там парадак. А цяпер у Іспаніі новы сацыялістычны ўрад. На парламентарны выйгрыш сацыялістаў напэўна паўплываў тэракт, бо людзі крытычна ацанілі вынікі кіравання краінай праамерыканскімі кансерватарамі. Кандыдат на прэм'ер-міністра ўжо заявіў аб намеры вывесці іспанскі кантынгент з Ірака. А Амерыка няхай сама скача, бо іншыя краіны таксама могуць пайсці следам Іспаніі. Гэта не вялікі гонар і шчасце класці галаву за амерыканскія інтарэсы.

ЗША хочуць закабаліць усе народы свету, асабліва краіны багатыя сыравінай, напрыклад, нафтай. Прытым робяць яны гэта пад шырмай свабоды, дэмакратыі і развіцця эканомікі. Але гэта пустыя словы, аб чым мела магчымасць пераканацца сама Польшча, дарэмна разлічваючы на інвестыцыі для польскіх прадпрыемстваў.

Аднак польскі ўрад не хоча вучыцца на чужых памылках і ўзяць прыклад з Іспаніі. Пакуль у нас не было тэрактаў і дай Бог, каб так было далей. Але хто можа быць пэўны заўтрашняга дня? Наш урад у сваёй наіўнасці далей ліжа пяты Амерыцы і не слухае парад разумных людзей ды не выводзіць нашых салдат з Ірака.

Мікалай Панфілюк

Кожнаму жыць — па-свойму

Калісь Шэршань у „Новай дарозе" пісаў: „У Іране, Тэгеране, сабраліся трое драней..." Сёння ў гэтым раёне сабраліся іншыя сілы на барацьбу з тэрарызмам. Нядаўна адзначалася першая гадавіна вызвалення Ірака. Сумная гэта падзея, а вынікі прынесенай на ракетах свабоды таксама жудасныя: няма электраэнергіі, знішчаная прамысловасць, шмат забітых і раненых.

ЗША без прычыны напалі на Ірак. Амерыканцы шукалі зброі, не знайшлі, шукаюць тэрарыстаў з „Аль-Каіды" і не знаходзяць іх ні ў Іраку, ні ў Афганістане. А яны б'юць чужынцаў, дабраліся ўжо да Іспаніі, на прыцэле Польшча.

Хто гэтаму вінаваты? Калі лекар лечыць хворага, шукае прычыну хваробы. Па-мойму прычынай гэтаму з'яўляецца сам прэзідэнт ЗША Буш, які заклікае ўрады свету памагаць Іраку ва ўсталяванні там амерыканскай дэмакратыі. Але забывае ён, што Ірак не прасіў такой свабоды, што ірацкі народ жадае выраду акупантаў са сваёй тэрыторыі. Амерыканцам трэба ведаць, што кожны народ хоча жыць па-свойму.

Дзядзька Захар

Мы на мяжы з Беларуссю

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дырэктар Гражына Куклік верыць у сэнс вучобы беларускай мовы

Звестка пра адраджэнне навучання беларускай мовы ў Бабіках на Сакольшчыне ўразіла не менш, як першая бура з маланкамі, раніцай 21 сакавіка.

Еду ў Бабікі. На двары пахне ўжо вясной. Гадзіну з гакам таўклася я ў Саколцы. Тут на аўтобусным прыпынку, хоць бедна і балоціста, заўсёды можна пачуць беларускую мову. Звычайна разам з беларускай чуецца і польскую мову, часам у адным сказе.

— Patrzyj jak gusi lecą, вясна будзе, — разважае ўголас дзядзька ў скуранай куртцы.

— Абрыдла ta zima, як тая горкая рэдзька, — адказвае дзядзька, таксама ў скуранцы.

І я не магу адарваць вачэй ад ключа дзікіх гусей, які з крыкам ляціць у напрамку квартала „Зялёна", значыць на ўсход.

Але вось і аўтобус на Шудзялава.

Едзем па Татарскім шляху, наш шафёр таксама з выгляду змахвае на татарына. Едзем пад музыку дыскапола гурту „Milano", хіба трыццаць кіламетраў у гадзіну.

Дарогі тут — хоць ты плач. Дзіравая гравейка або брукаваны разбіты тракт. Трасе — як халера.

Узіраюся ў знаёмы мне краявід і як тыя ручаі, што зараз разліліся ў лагчынах, заліваю мяне шчасце.

— Якое ліха прымусіла людзей пакідаць такую прыгожую зямлю?

Мінаем здзічэлыя сады і стаўбы па будынках.

Між Гарчакамі і Войнаўцамі заходні турыст на джыпе, праз ларнет сочыць за дзікім птаствам.

У пачатку Бабікаў змена настрою — новы будынак школы.

— Ці не задумалі ў вас ліквідаваць школу? — пытаю настаўніц, якія прыехалі разам са мной з Саколкі і зараз ідзем у школу.

— Чаму ліквідаваць? Яе нядаўна пабудавалі.

У Беларусі нашы магчымасці

— Школа мае сто сорак гадоў традыцыі, — кажа дырэктар Гражына Куклік, — новую пабудавалі чатыры гады таму. На цэнтральным месцы — куточак патрона Адама Міцкевіча. У канцы калідора этнаграфічны куточак. Палову месца займае ткацкі варштат, скрыні, калаўротак, велікодныя пальмы і вышыванкамі.

— Te nasze ręczniki jakby białoruskie, — гадае пані дырэктар.

— Дзень добры! Дзень добры! — вітаюцца з усіх бакоў вучні.

— Чаму думаеце пра беларускую мову?

У адказ разважныя, цвярозыя словы:

— Мы жывем ля мяжы з Беларуссю і найбольш кантактаў у нас з гэтай дзяржавай. Там нашы магчымасці. Гандляваць або супрацоўнічаць будзем найперш з Беларуссю, а не з Амерыкай.

На сённяшні дзень школа супрацоўнічае са сваім партнёрам-школай у Адэльску, што па другім баку мяжы. Тут важныя і гістарычныя сувязі, да вайны многія продкі тутэйшых вучняў прыналежылі да каталіцкай парафіі ў Адэльску.

Дырэктар школы родам з Шудзялава і „Ніву" добра ведае.

— Мой муж з Гуранаў і ён вывучаў беларускую мову ў школе, — кажа.

— I pamiętam z dzieciństwa jak występowała u nas „Lawonicha", — dadae, — ależ to było piękne!

Аўтобус назарэз патрэбны

Экскурсію па школе пачынаем з дыдактычных залаў. Прасторна тут і калярова. Гонарам школы з'яўляецца камп'ютэрная зала. За жалезнай кратай інфарматычны кабінет з 14 камп'ютэраў. Падарыў іх школе КРУС, узамен за правядзенне камп'ютэрных курсаў для земляробаў.

Пытаю пра зацікаўленне.

— Прыходзяць не толькі маладыя людзі, але і пенсіянеры. Ужо перашколілі дзвесце сорак асоб, — кажа Гражына Куклік.

З першага класа ўсе школьнікі займаюцца ў інфарматычным гуртку. Ідзе пра роўныя шанцы ў Еўрасаюзе.

— А якія замежныя мовы ў вас?

— Абавязковай — нямецкая. Многія вывучаюць рускую. З новага навучальнага года плануем увядзенне англійскай і беларускай.

Пані дырэктар цікавіцца, ці сапраўды можна атрымаць дадатковыя сродкі на навучанне беларускай мовы. У беднай гміне, як Шудзялава, кожная залатоўка святая.

— Нам назарэз патрэбны школьны аўтобус, — прызнаецца дырэктар.

У Бабіках Пачатковая школа, разам з нулявым класам, налічвае 110 навучэнцаў. Гімназісты даязджаюць у Шудзялава з 17 вёсак.

— У нас адзін стары аўтобус. Праца цалкам залежыць ад яго курсіравання. І так, найперш звозім гімназістаў, якія чакаюць пакуль пазбіраем і прывязем гэтых малодшых, а тады вязем іх ужо ў гміну. Першыя вучні прыязджаюць ужо ў шэсць гадзін і сорак хвілін. Кожны пяты — без снедання. Проста зарана, каб акуратна паснедаць.

Словам, кашмар.

У пошуках сенсацыі

Па дарозе ў Бабікі я таксама думала пра „Лявоніху". Менавіта, тут на Сакольшчыне я пачула найпрыгажэйшы успамін пра гэты легендарны беларускі гурт. Як адзін яго паклоннік закахаўся ў спявачку. Пасля канцэрта, калі „Лявоніха" рушыла ў дарогу, ён сеў на матацыкл і іх следам доўга яшчэ ехаў за аўтобусам.

Фатаграфую будынак старой пошты ў Бабіках. Звычайны драўляны домік з ганкам. У 1970-я працаваў тут наш карэспандэнт і папулярызатар „Нівы" Эдвард Шчасновіч родам з недалёкіх Шчасновічаў.

Настаўніцы Анна Вандалоўская і Яўгенія Лянкевіч добра памятаюць Эдварда Шчасновіча.

— А мы таксама вучыліся беларускай мове ў школе, — успамінаюць, і гэты ўспамін ім прыемны. — Чыталі „Зорку" і „Ніву". Пані Геня сама родам са Слоі, доўгі час настаўнічала ў Кнышэвічах (школу далучылі да Бабік).

— Там мае сябры вучыліся — называю братоў: Валодзю і Мірка Пацаў родам з Кнышэвіч. Валодзя зараз вядомы ў Польшчы як карэспандэнт Польскага радыё ў Мінску. Настаўніца заўсёды верыла ў Валодзю:

— Ten starszy był bardziej ruchawy, — успамінае пані Геня — усё хацеў ведаць, усім цікавіўся.

— А да майго бацькі журналіст „Нівы" прыязджаў, інтэрв'ю браў, — кажа пані Аня, сама родам з Сухініч. Якраз пра яе вёску едзе наш аўтобус. Шафёр спыняецца пад яе домам. Сёння таксама мама пані Анны выйшла паглядзець на дачку. Праз прыадчыненыя дзверы аўтобуса перадае ёй малако.

— Ой, мама! — узрушаецца пані Анна.

А я ўзіраюся на ўзгоркі і лагчыны паміж якімі блішчаць вясновыя ручаіны і льецца знаёмая мне музыка.

— Вы пра калодзеж у Сухінічах напісалі б, — просіць шафёр, таксама зацікаўлены „Нівай". Калодзеж мае чорную славу, прыцягвае дарожныя катастрофы.

— Я ж не шукаю сенсацый, — кажу з хрысціянскай пакорай.

Смяемся. Нядаўна ў Бабіках мясцовы бацюшка змяшаў мяне з гразю. Калі я распытвала пра парафію ў Самагрудзе — кінуўся на мяне тыграм: — Pani tu szuka religijnych sensacji! Праўда, сенсацыі датычылі адно яго асобы, але па прычыне Вялікага посту, дарую гэты аповед.

Ганна КАНДРАЦЮК

Закон быў патрэбны

З пачаткам студзеня г.г. абавязвае новы кодэкс працы. Ужо ў час яго падрыхтоўкі паміж удзельнікамі трохбаковага пагаднення з'явіліся супярэчлівасці пры запісе аб супрацьдзеянні мобінгу — псіхічнаму тэрору на працы.

Аргументы прафсаюзных арганізацый перамаглі. Факт стаўся фактам. Закон аб супрацьдзеянні мобінгу пачаў абавязваць. Абазначае гэта на практыцы, што працаўнік, які адчувае насмешлівыя адносіны з боку прадпрымальніка ці супрацоўнікаў на рабоце, адчувае пагрозу шэфа аб увальненні, бо супраціўляецца ягоным незаконным загадам, можа падаць заяву ў суд працы і патрабаваць кампенсацыі за маральны здзек. Паводле ацэнкі аналітыкаў, судам прыбудзе працы, бо з міжчалавечымі адносінамі як на дзяржаўных прадпрыемствах, так і ў прыватных фірмах справа не найлепш маецца.

Напрыклад, ненайлепшыя міжлюдскія суадносіны пануюць на Беластоцкім мясакамбінаце, які цяпер стаў суполкай „БОСА". Справа тычыцца ўвальнення з працы лідэраў трох прафсаюзных арганізацый, існуючых на прадпрыемстве: „Салідарнасці '80", „Салідарнасці" і „Працаўнікоў транспарту". У аргументацыі праўленне суполкі „БОСА" заяўляла, што яны прычыніліся да нанясення затрат прадпрыемству. У сапраўднасці прафсаюзнікі сцяной сталі за працаўнікамі, калі кіраўніцтва фірмы прапанавала дагаворы па новых прынцыпах. Найбольш бударажыла справа дадатку за працоўны стаж, які адмяняўся з пачаткам студзеня г.г. Прызначанае ўзамен прэміяльнае не задавальняла нікога, паколькі, як тлумачылі прафсаюзнікі: „сёння далі, а заўтра адменяць".

Увольненым лідэрам прафсаюзаў забаронена было заходзіць на прадпрыемства, а прафсаюзным арганізацыям — удзельнічаць у сходах. Аднак саюз „Прышласць", які арганізаваўся па ініцыятыве кіраўніцтва, а ў радах якога апынуліся адміністрацыйныя чыноўнікі, мог свабодна дзейнічаць і рашаць аб найважнейшых справах Мясакамбіната ў якасці кансультанта. Увольненыя падалі справу ў Суд працы, які прызнаў, што ўвальненне наступіла з парушэннем законаў і за гэта аштрафаваў кіраўнікоў на 5 тысяч зл. кожнага.

Аднак судовы прыгавор не вырашыў праблемы ўвольненых. Не вярнулі іх на працу. Надалей не дазваляюць ім заходзіць на прадпрыемства. У справу ангажаваўся сенатар Кшыштаф Юргель і намеснік ваяводы Ежы Паўяновіч. Калі прадстаўнікі ўлады ў кампаніі паліцыянтаў і ўвольненых прафсаюзнікаў падаваліся ў палове сакавіка на перагаворы з праўленнем „БОСА", апошніх за браму ахоўнікі не прапусцілі.

Зараз ніхто не хоча гаварыць наконт канфлікту паміж прафсаюзнікамі і кіраўніцтвам прадпрыемства, паколькі людзі баяцца страціць працу. Па загаду кіраўнікоў ахоўнікі прымянілі строгі кантроль за працаўнікамі ў час працы і падвяргаюць іх дэталёвай асабістай праверцы на фабрычнай браме. За найменшую „правіну" можна апынуцца на бруку. А на шэфаў „БОСА" нават судовае рашэнне і прадстаўнікі ўлады не змогуць паўплываць.

Кастусь Млынарскі

Памяняць упакоўку

Напрыканцы лютага пачуў я ў тэлебачанні, што харчовыя прадпрыемствы вымушаны да ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз памяняць упакоўку на свае тавары.

Аўтар перадачы шчыра прызнаўся, што некаторым фірмам будзе гэта не пад сілу і яны проста абанкруцяцца. Раней нашы прадпрымальнікі сцягнулі з Захаду машыны для вырабу фольгавай ўпакоўкі ды пластмасавых бутэлек, пераважна на харчовыя прадукты, а цяпер гэтая ўпакоўка аказваецца быць шкоднай для здароўя. У заходніх краінах ужо даўно ліквідуюць пластмасавую тару. Цяпер айчынным фірмам прыйдзецца мяняць тэхналогію выпуску ўпаковачных вырабаў, гэта так, быццам выкінуць мільёны злотаў у балота. Неўзабаве Захад заваліць нас сваімі прадуктамі харчавання, што давядзе нашу сельскую гаспадарку да заняпаду. **(мл)**

Людзі мокнуць у Гайнаўцы

У Гайнаўцы працуюць дзве лініі гарадскога транспарту. На аўтобусах лініі № 2 з вакзалаў ПКП і ПКС можна даехаць у напрамку Дубін і вярнуцца назад, а другім маршрутам „1" — ад Юдзянкі ў Горнае і назад. Можа толькі шматразовасць праездаў гарадскіх аўтобусаў асабліва пад вечар у будныя дні ды ў суботы і нядзелі замалая.

І яшчэ адно: замала дашкаў на аўтобусных прыпынках на абедзвюх трасах, нават у цэнтры горада. Ёсць дашкі сям-там па вуліцах 3 Мая, Баторыя, Ліпавай, Пілсудскага, Рэя, а таксама адзін па вуліцы Белавежскай (насупраць чыгуначнага вакзала) і два па вуліцы Беластоцкай (у тым ліку адзін каля былой Хімічнай фабрыкі), але яны ўжо разбураныя, пабітыя. Дзе тады схавацца, калі падае дождж або віруе мяцеліца?

(яц)

Ой, як смецім...

З першага мая наша краіна стане членам Еўрапейскага Саюза. Усё тады зменіцца, у тым ліку і цэны. Адны тавары падаражэюць, іншыя стануць таннейшымі. Толькі нам, пенсіянерам, нічога не зменіцца.

Затое ў Міхалове, на аўтобусным прыпынку, прыбудзе пустых бутэлек з-пад піва і шмат-якіх „кактэйляў", бо ў Еўрасаюзе цэны на алкагольныя напоі ніжэйшыя. Ці войт Міхалоўскапй гміны не бачыць, як у цэнтры мястэчка валяецца смецце і тара? Ці нельга забараніць уладальнікам магазінаў продажу алкаголю на вынас. Калі іх кліенты хочуць напіцца, хай робяць тое ў крамах, а не на прыродзе.

Далучацца да Еўрасаюза з засмечанымі мястэчкамі не выпадае. **(дз)**

Які сэнс?

— Гэта нагрувашчанне фраз, з якіх нічога не вынікае! — грымела апазіцыя ў час прымання Праграмы Падляшскага ваяводства да 2006 года ў час апошняй сесіі сейміка.

На пачатку дыскусіі над гэтай у больш чым сорак старонак праграмай вядомы з антыпатыі да нацыянальных меншасцей радны Лігі польскіх сем'яў (LPR) Зэнан Дзедзіц спрабаваў правакаваць:

— Вы тут забылі аб жыдоўскай меншасці. На чацвёртай старонцы дакумента пералічаны меншасці, якія пражываюць на тэрыторыі нашага ваяводства: беларусы, літоўцы, украінцы, татары ды ромы. Пакуль што, існуе яшчэ жыдоўская меншасць. Ёсць у Беластоку аддзел Саюза веравызнанневых гмін. Пазбяганне гэтай тэмы сведчыць аб нейкіх фобіі ці прадузятасці.

Віцэ-маршалак Караль Тыленда „ўзняўся вышэй свайго ўзроўню":

— Мы хацелі ўзяць пад увагу гэтую меншасць, але пан Адам Дабронскі [гісторык і віцэ-старшыня сейміка — М. Х.] сцвердзіў, што жыдоў у нас няма.

Гэтае выказванне выклікала цынічную радасць — гучны смех і апладысменты — сярод радных апазіцыі, значыць, Грамадзянскай платформы — Права і справядлівасці (PO-PiS) ды LPR.

У пытаннях важных, а якія датычылі праграмы, было зазначана, што няма ў ёй выдзеленых прыярытэтаў — канкрэтных мерапрыемстваў і інвестыцый, якія на працягу найбліжэйшых гадоў маюць быць рэалізаваныя. Гэта настолькі важна, што ваяводская праграма — падстава для здабыцця грошай у рамках г.зв. кантракта з урадам і еўрасаюзных сродкаў. З запісу праграмы вынікае, што паўднёва-ўсходняя частка Беласточчыны будзе „накіравана на шматфункцыйны развой вясковай тэрыторыі, сярод гэтага пазасялянскіх функцый, вытворчай і пераапрацоўчай ды турыстычнай дзейнасці на тэрыторыі Белавежскага нацыянальнага парку, а таксама надбужанскага Падляшша". Далей можна вычытаць: „Бельск-Падляшскі і Сямятычы, якія маюць карыснае распалажэнне пры дарозе № 19, у якіх ёсць добрая інфраструктура, накіраваны на размяшчэнне малых і сярэдніх прадпрыемстваў і абслугоўванне транзітнага руху поўнач — поўдзень. Падобную ролю прыпісваецца Гайнаўцы, распаложанай на дарозе да мяжы дзяржавы". Аўтары дакумента, значыць, управа ваяводства, падкрэсліваюць, што Сямятычы і Гайнаўка маюць выпаўняць ролю лакальных цэнтраў абслугоўвання турызму.

Адна з мэт развою звяртае ўвагу на шматкультурнасць і шматканфесійнасць рэгіёна. Таму ваяводскі самаўрад намерваецца захоўваць звязаную з гэтым культурную спадчыну шляхам, як кажуць, „рэгістравання і даследавання помнікаў, павялічванне дбайнасці аб музеях і супрацоўніцтва з дзяржаўнай і самаўрадавай адміністрацыяй, уласнікамі і карыстальнікамі помнікавых і гістарычных аб'ектаў у галіне іх рэстаўрацыі, кансервацыі і добраўпарадкавання".

У іншай з мэт пералічваецца ў чарговы раз як важны „фактар развою ваяводства" супрацоўніцтва памежных рэгіёнаў з Беларуссю і Літвой, а сам Беласток мае быць „сувязным паміж краінамі ўсходняй і заходняй Еўропы". Зноў не пералічваюцца ніякія планаваныя, канкрэтныя мерапрыемствы на гэты конт. Рэшта апісваецца як „узмацнянне супрацоўніцтва", „ушчыльнянне сувязей" і г.д.

Больш канкрэтаў паявілася ў пункце апісваючым дзеянні якія будуць рэалізавацца за грошы ЕС, значыць, галоўным чынам, са сродкаў у рамках такіх праграм як SAPARD ці ISPA. Нейкая навінка — заява наконт трохбаковай праграмы Польшча — Беларусь — Украіна, у рамках якое будуць фінансавацца Еўрасаюзам інвестыцыі на гэтых пагранічках. **(мах)**

Вачыма паляка

Праблемная „Ніва"

Ад пачатку гэтай кадэнцыі ваяводскага сейміка рэдакцыю „Нівы" запрашалі на сустрэчы. Больш-менш раз у месяц бюро сейміка прысылала нам парадак абрад і большасць праектаў пастаноў, якія мелі там рашацца. Месяц таму гэта змянілася. Раптам перасталі да нас даходзіць гэтыя „квіты". Толькі выпадкова даведаліся мы аб апошняй і папярэдняй сесіях. Паколькі рэгулярна прыслухоўваўся я ад імя рэдакцыі дыскусіям ваяводскіх радных і аб важнейшых справах інфармаваў нашых чытачоў, рашыў разведаць, што такое здарылася.

Прэс-інфарматарка маршалкоўскай установы не скрывала свайго здзіўлення, ды з агаворкай, што яна прадстаўляе толькі маршалка і іншых членаў управы, значыць, мясцовую выканаўчую ўладу. Сеймік — гэта не ейная „дзялянка", бо гэта заканадаўчая ўлада. Ну, і, вядома, іншы паверх ва ўстанове. Аднак ветліва скантактавала мяне з адказнай за справы інфармавання медыяў працаўніцай бюро сейміка. У час апошняй сесіі тая элегантная пані папрасіла ў мяне прабачэння. Не ўмела (?) растлумачыць, што такое здарылася. І тут я, так сказаць, здурнеў. Пані загадала, хоць у далікатны спосаб, даць адрас „Нівы". Здзіўлены, запытаўся я ў яе:

— У вас няма нашага адрасу. А за апошні год высылалі нам заявы аб чарговых сесіях?

— Здаецца, не.

Не ўмеў я з памяці падаць, асабліва індэкс, неабходны пры карэспандэнцыі, і запытаўся:

— І што цяпер зробім?

— Пазваніце мне і дайце адрас, — пачуў ад мілай чыноўніцы бюро сейміка.

Усю ноч раздумваў я, якую можа мець праблему з тым, каб знайсці адрас „Нівы" пані чыноўніца. Ёсць ён, напрыклад, у тэлефоннай кніжцы. У тым жа будынку, некалькі паверхаў падымаючыся на ліфце, можна праверыць яго ў прэсавым аддзеле ўправы. Ну, але, мабыць, гэта залішні клопат, асабліва тая язда на ліфце. Не мог я не мець уражання, што, як за былых часоў, для некаторых чыноўнікаў наведвальнік, а асабліва журналіст, гэта нахабны, нежаданы клопат. Чыноўнік і на тое ёсць, каб чыноўнічаць, завалены паперамі, а тое чыноўнічанне служыць яму самому ды ягоным начальнікам.

Пры нагодзе прыгадалася мне, як нядаўна працаўнікі аднаго з беластоцкіх могільнікаў рабілі падмуроўку на магіле маёй мамы. Абяцалі, абяцалі, і ўрэшце зрабілі, да таго вельмі салідную. Толькі не на мамінай магіле, а пахаванаму побач мужчыну, пэўна, на здзіўленне ягонай сям'і.

За няпоўныя чатыры тыдні будзем у Еўрасаюзе. Усе. І я, і вы, дарагія ўсе Чытачы РП. Але і тая прамілая ваяводская чыноўніца, і тыя паны з могільніка. Тае падмуроўкі надалей, як не было, так і няма на магіле маёй маці. А карэспандэнцыю з сеймікавага бюро ўсё чакаем.

Мацей Халадоўскі

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У Гайнаўскай Школе н-р 6 запрэзентавалі посныя стравы — рэцэптуры вышукалі самі вучні

Воўк

(беларуская народная казка)

Жыў-быў стары бацька і было ў яго трох сыноў: двух разумных і трэці — дурны. Загадаў бацька сад пільнаваць.

У першую ноч найстарэйшы пайшоў. Чакаў-чакаў, змарыўся ды заснуў пад дрэвам. Раніцай бачыць — яблыкі абарваныя.

Пайшоў у другую ноч сярэдні брат і таксама злодзея не ўпільнаваў, праспаў.

Чарга дурню ісці. Пайшоў ён рад-няволя, узяў з сабой шчотку. Паставіў шчотку пад бараду, сам сябе за нагу да яблыні прывязаў і задрамаў. У поўнач шчотка з-пад барады выскачыла, дурань прачнуўся, падскочыў. Бачыць — святло кругом. На галіне Жар-птушка сядзіць і яблыкі зрывае. Стаў яе дурань лавіць-хапаць... і толькі адну пярынку з хваста паспеў вырваць.

Раніцай бацьку паказаў.

— Ідзіце сыны ў свет, — кажа бацька, — адшукайце мне гэтую Жар-птушку.

Ішлі тры сыны, ішлі, аж на месца, дзе тры дарогі дабіліся. Сталі гадаць — куды каму падацца. Найстарэйшы кажа:

— Я пайду дарогай шчасця.

Другі:

— Я таксама.

А трэцяму, дурню, на тую дарогу што смерць, падказалі ісці.

Прайшоў тры вярсты дурань. Сустракае яго воўк.

— Куды хлопча ідзеш?

— Бацька загадаў Жар-птушку злавіць. Што мне рабіць?

— Я цябе з'ем, — кажа воўк.

Дурань толькі нізка пакланіўся:

— Еш, твая воля.

Воўк павіляў хвастом:

— Ну добра, сядай, паехалі.

Прыязджаюць яны ў другое царства, у якім Жар-птушка жыла.

— Ідзі ў палац і вазьмі ціха птушку, — кажа воўк, — толькі глядзі, каб з клеткай не ўзяў.

Пайшоў дурань у двор, знайшоў Жар-птушку ў клетцы і думае — тая клетка за птушку лепшая, як жа ж не ўзяць яе? Узяў і нясе. Раптам шум учыніўся, у двары прачнуліся, дурня злавілі і на загубу вядуць.

— Хіба... што з трэцяга царства лятучага каня дастанеш. Тады і Жар-птушку табе аддадзім, — кажуць.

Вяртаецца дурань да ваўка, плача:

— Я цябе з'ем, — кажа воўк.

— Еш, твая воля.

Воўк пастаяў і гаворыць.

— Сядай на мяне, паедзем.

Едуць яны, едуць, прыязджаюць у трэцяе царства-каралеўства. Воўк стаў і кажа:

— Ідзі ў двор у стайню, там сівы конь стаіць, толькі памятай каб без аброці каня ўзяў.

Пайшоў дурань у стайню, бачыць, што аброць лепшая за каня, ўзяў за аброць і са стайні выводзіць. Тут шум учыніўся, злавілі дурня і кажуць:

— Хіба што... з чацвёртага царства каралеву нам дастанеш — тады і каня аддадзім.

Ідзе дурань да ваўка, слязьмі заліваецца.

— Я цябе з'ем, — кажа воўк.

— Еш, тваё права.

— Ну годзе, — кажа воўк, — сядай на мяне...

(працяг будзе)

(гак)

Вершы Віктара Шведа

Баюся, што пазнаюць

Спадзеючыся гасцей Мішка —
Быў тэлефонны іх намёк —
Хавае з полкі ў шафу кніжкі
І замыкае на замок.

Матуля здзіўлена пытае:
— Баішся што табе ўкрадуць?
— Баюся, што свае пазнаюць,
Перад іх вокам
лепш замкнуць.

Ці лёгка стрымаць тайну?

З пытаннем незвычайным
Звярнуўся да маткі Марцін:
— Скажы, матуля, ці тайну
Лёгка стрымаць у жыцці?

— Пытаннем небывалым
Не муч мяне, сынок.
Стрымаць не прабавала
Я тайны нат разок.

Сустрэча з Віктарам Шведам

14 лютага 2004 г. вучні першых класаў II Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім сустрэліся з беларускім паэтам-„белавежцам" Віктарам Шведам.

Госць пазнаёміў нас са сваёй апошняй кніжкай „Мае айчыны", якую мы мелі магчымасць купіць. У гэтым зборніку вершаў знойдзем творы, якія гавораць аб роднай зямлі, аб Падляшшы — нашай малой айчыне. Аўтар у вершах гаворыць, што трэба заўсёды памятаць, хто мы такія і адкуль родам, што нельга саромецца сваіх продкаў. У кніжцы знаходзяцца таксама вершы прысвечаныя канкрэтным людзям, напрыклад „Жыхарам вёскі Мора", у якой нарадзіўся і выхаваўся паэт (аўтар не забывае аб сваёй роднай вёсцы, таму некалькі твораў прысвяціў Мору).

Віктар Швед прачытаў нам самыя блізкія яго сэрцу творы. Былі гэта вершы пра падляшскую прыроду, наш сучасны свет, а таксама і пра каханне, а нават — пра памідоры.

Найбольш нас зацікавілі вершы пра каханне, якія ў большасці мы слухалі з увагай. У гэтых вершах В. Швед паказвае, што каханне вельмі важнае, без яго жыццё было б шэрае і сумнае. Відаць, што паэт таксама кахаў, думаю, далей кахае.

Аднак найбольшае зацікаўленне выклікаў верш „Памідоры", які расказвае пра адзін эпізод з жыцця паэта, а менавіта пра перыяд пабыўкі ў Маскве, калі нельга было купіць свежую агародніну. Тады знаёмая В. Шведа падаравала яму скрынку памідораў.

Наша паэтычная сустрэча закончылася супольным здымкам. Думаю, што такія спатканні вельмі патрэбныя нам, маладым людзям, якія шукаюць адказ на вельмі цяжкое пытанне — хто мы? Сустрэча з Віктарам Шведам дапамагла многім вучням наблізіцца да таго адказу.

Лукаш Верамяюк, I „ц". кл.

На ўроку праваслаўнай рэлігіі ў Бабіках

Школа сярод маляўнічых узгоркаў

У Бабіках на Сакольшчыне надта ветлівыя дзеці. Калі ў час перапынку я аглядала іх каляровыя класы — з кожнага боку далятала прывітанне: Добры дзень! Добры дзень! З другога боку — настаўнікі ведаюць усіх сваіх выхаванкаў па імёнах!

Школьны дзень для многіх навучэнцаў пачынаецца вельмі рана. Некаторыя прачынаюцца ўжо ў пяць гадзін раніцы. Школьны аўтобус доўга кружыць па з'езджаных дарогах, пакуль пазбірае дзетак аж з семнаццаці вёсак.

Затое ў школе вельмі сямейная атмасфера. У дзевяць гадзін дзеткі спажываюць (некаторыя першае) снеданне — гарачы суп. Снедаюць усе — тыя, у якіх цяжкая сітуацыя карыстаюцца сацыяльнай дапамогай.

Усе дзеці ходзяць на камп'ютэрны гурток — і веды тут перакладаюцца на канкрэтныя вынікі. З 2000 года ў Бабіках выдаецца школьная газетка, штомесячнік „Zgrywus", які прадаецца таксама навакольным жыхарам. За грошы ад продажу школьнікі купляюць паперу і парашок для ксеракса.

У школе — пад кіраўніцтвам настаўнікаў — дзейнічае гурток юных натуралістаў. У падвалах школьнага будынка дзеці вырошчваюць расліны і гадуюць жывёл. Удзельнікі гуртка рэдагуюць газетку „Крулічак" (назва ад любімага труса, якога гадуюць дзеткі). Сярод іх пяцікласнікі: Марлена Нарбут, Агнешка Горчак, Рэната Паніквіцкая. У газетцы можна прачытаць цікавыя весткі пра звяроў, вучнёўскія вершы, апавяданні пра расліны ды жывёл.

Зацікаўленасць справамі прыроды ўдала спалучаецца з наваколлем. Новы будынак школы знаходзіцца ў пачатку вёскі, між маляўнічых узгоркаў і лугоў.

У канцы школьнага калідора — этнаграфічны куточак. Прылады і вышыванкі пазбіралі самі вучні ад сваіх бабуль. Убачым тут кросны, калаўротак, каробкі, вышыванкі. У будучыні вучні хочуць праводзіць тут заняткі па гісторыі рэгіёна.

У школе, разам з нулявым класам, 110 навучэнцаў. Абавязковай замежнай мовай тут нямецкая. З новага навучальнага года ў школу хочуць увесці беларускую і англійскую мовы. Проста, тут думаюць па-еўрапейску!

Зорка

Дарагая „Зорка"!

Наш клас 5 сакавіка 2004 г. ездзіў на экскурсію ў вёску Буды. Мы глядзелі старыя будынкі — хаты, клуню і хлеў. На панадворку мы ўбачылі калодзеж з жоравам, абарог, вазы, сані, вупраж і старыя прылады працы.

У хаце нас захапілі вышываныя ручнікі, макаткі, плахты, выцінанкі на вокнах. Самай важнай у хаце была гліняная печ. На печы і паліцы стаяў гліняны і драўляны посуд. Мы пазнаёміліся са штодзённым побытам нашых продкаў.

На заканчэнне экскурсіі ў нас было вогнішча. Мы вельмі задаволеныя паездкай у Буды. Спонсарам экскурсіі быў Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

Паўліна Паскробка, IV кл. ПШ у Дубінах

Максім Танк

Як вясна прыйшла

Як вясна прыйшла ў гаі,
Разбудзіла ручаі
І паклікала ізноў
Птушак з выраю дамоў.
Прыляцелі жаўрукі,
І зязюлі, і шпакі,
Качкі, чэпікі,
З імі ластаўкі.
На лугі, на паплавы
Прыляцелі журавы,
Буслы, кнігаўкі...
Дзе ты тут усіх
Пералічыш іх!

Польска-беларуская крыжаванка № 14



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 10: Мова, смак, кос, слімак, клуня, галіна, арганізатар, цот, вока, танк. Мост, ігрок, маг, палац, кіно, ніт, адказ, арт, куртка, тон, сябрук.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Марцін Стоцкі**, **Ева Шарэйка**, **Дарота Цімашук**, **Паўліна Паскробка**, **Бася Хіліманюк**, **Паўліна Паўлючук** і **Паўліна Мялешка** з Дубін, **Наталля Каўшук** і **Ева Каўбасюк** з Гайнаўкі.

Пажартаваў

— Ты ўжо ідзеш у першы клас, — сказаў старэйшы брат, — а ці ўмееш добра вымаўляць словы? Скажы мне — сасна.

Я рашыў пажартаваць і сказаў — сашна.

— Не, не! Са-сна.

— Са-шна, — на тое я.

— Тады скажы кніжка.

— Кніска.

— Саша.

— Саса.

— Школа.

— Скола.

— Ой, нічога з цябе не будзе. Будзеш ты хадзіць на навуку вымаўлення слоў, — аўтарытэтна заявіў мой брат.

Выйшаў брат з дому, а я кажу маме:

— Не кажы яму, што я ўмею добра вымаўляць словы, няхай ён думае, што ў мяне праблемы з мовай.

— Я слухала цябе і не магла зразумець, чаму ты гэтак калечыш словы? — запытала мама.

— Няхай думае, што гэта ён найразумнейшы.

Брат падслухаў нашу размову і за ілгунства хацеў мяне адлупцаваць. Я ўвесь дзень уцякаў ад яго — толькі вечарам мінула ягоная злосць.

Данель Юрчук, Гайнаўка

Я. Янчук: 25 Сакавіка святкуюць беларусы ва ўсім свеце і дзякуючы гэтаму мы знаходзімся ў адной духоўнай і культурнай прасторы...

25 Сакавіка ў Гайнаўцы

Святкаванне 25 Сакавіка ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы распачалося яшчэ ў дзевяностых гадах. З гэтага часу штогод 25 сакавіка або напярэдадні свята адбываюцца ў школе ўрачыстыя лінейкі, вучні размаўляюць на ўроках пра гістарычныя падзеі, якія давялі да абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 годзе. Апошнім часам на калідорах вучні расклейваюць плакаты з выявай беларускага герба — Пагоні і святочнымі лозунгамі.

25 сакавіка 2004 года ў школе былі арганізаваны дзве лінейкі, у час якіх перад вучнямі і настаўнікамі выступілі белгімназісты III „б" класа і белліцэісты I „д" і II „а" класаў. Напаміналі яны пра падзеі, якія папярэдзілі 25 Сакавіка і дэкламавалі патрыятычныя вершы. Вучні з вакальнага гімназічнага калектыву і „Знічкі" спявалі патрыятычныя песні. На зважай вучні і настаўнікі выслухалі гімн „Магутны Божа".

— Ужо трэці год запар я прысутнічаю на святкаваннях, — заявіла Амелія Горбач з III „б" класа, якая выступала перад гімназістамі. — Старэйшыя гімназісты ведаюць ужо пра свята 25 Сакавіка. Першакласнікі былі здзіўлены, бо не ведалі, што ў нашай школе адбываюцца такія лінейкі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ліцэісты I „д" і II „а" класаў дэкламавалі патрыятычныя беларускія вершы і расказвалі пра падзеі 1918 года

— Сёлета мінула 86 гадоў з дня, калі здзейснілася ідэя незалежнасці Беларусі. Арганізуючы мерапрыемства мы ўшанавалі не толькі тых беларусаў, якія змагаліся за незалежнасць радзімы ў 1918 г. У 1936-1937 гадах звыш 20 тысяч беларусаў страціла жыццё, якім была дарагая ідэя незалежнасці сваёй краіны. Трэба памятаць аб усіх, якія адналі жыццё за вольную Беларусь, — сказала Іаланта Грыгарук, якая падрыхтавала ліцэістаў на школьную лінейку.

— Добра было б, каб святкаванні былі яшчэ больш актыўнымі. Можа паказаць жыццёвыя сцэнкі або паставіць беларускую п'есу, — разважае Зося Лемеш.

— 25 Сакавіка святкуюць беларусы ва ўсім свеце і дзякуючы гэтаму мы знаходзімся ў адной духоўнай і культурнай прасторы, — кажа настаўнік гісторыі і апякун Клуба беларускіх спраў Яўген Янчук. — Трэба памятаць, што Акт 25 Сакавіка падпісвалі таксама нашы людзі з Беласточчыны.

— Ушанаванне ўгодкаў абвяшчэння незалежнасці Беларусі з'яўляецца падставай для існавання незалежнай беларускай дзяржавы. Зараз у Беларусі ідэі змагання за свабоду слова, друку далей актуальныя і трэба аб гэтым гаварыць, — тлумачыць настаўніца Вольга Сянкевіч, якая памагала гімназістам рыхтавацца да сакавіцкіх выступленняў.

На ўроку беларускай мовы вучні III „б" класа разам з настаўніцай Вольгай Сянкевіч абмяркоўвалі выступленне на школьнай лінейцы і рыхтаваліся пісаць справаздачу са школьных святкаванняў.

Аляксей Мароз

---

25 Сакавіка ў Варшаве святкавалі ўвесь тыдзень...

Беларускі тыдзень у Варшаве

На пачатак канцэрт...

Усё пачалося 22 сакавіка. У студэнцкім клубе „Proxima" зайграла беларуская рок-легенда — „Н.Р.М.". Ужо тыдзень да мерапрыемства па ўсім універсітэце паявіліся плакаты з інфармацыяй аб канцэрце. Арганізатары „Беларускай музычнай партызанкі II" (пад такім лозунгам праводзілася імпрэза) — Клуб Альбарутэніка, Інстытут беларускай культуры ў Варшаве, Звяз у падтрымку дэмакратыі ў Беларусі (ЗДБ) ды Беларускае аб'яднанне студэнтаў (БАС) — сур'ёзна паставіліся да прамоцыі канцэрта. У „Газеце выбарчай", у секцыі „Культура", паявіўся вялікі артыкул прысвечаны „Беларускай музычнай партызанцы II". У клуб „Proxima" прыйшло больш за 200 чалавек. Сярод іх былі беларусы, палякі ды невялікая група падляшукоў.

Трэба сказаць, што да канцэрта „Н.Р.М." падыходзіў я крыху скептычна — сама менш тры апошнія канцэрты гэтага гурту, якія я бачыў — былі зусім няўдалымі. Але маё меркаванне не апраўдалася.

— Стараюцца хлопцы, — скаментаваў задаволены Тамаш Суліма.

Хаця „Н.Р.М." быў адзіным гуртом, які ў гэты вечар з'явіўся на сцэне, публіка ад самага пачатку гуляла вельмі добра і горача ўспрымала ўсе старыя ды новыя песні „Мроі".

... затым пікет...

У Дзень Волі ЗДБ сарганізаваў пікет пад Сеймам. Ідучы на вуліцу Вейску я думаў, што сустрэну некалькі дзесяткаў прыхільнікаў ідэі 25 Сакавіка. Аднак паявілася там не больш за 17 чалавек. Як сказалі мне члены ЗДБ, з аднаго боку гэта нямнога, але з другога — афіцыйна не змагло быць больш людзей, бо ў гарачцы падрыхтоўкі да канцэрта „Н.Р.М." не паспелі яны паінфармаваць паліцыю ды атрымаць дазвол на пікет з большай колькасцю людзей. Цікава, большасць удзельнікаў сустрэчы пад Сеймам гэта палякі.

— Не падабаецца мне палітыка Лукашэнкі ў Беларусі. Гэтая краіна заслугоўвае лепшага ўрада, — сказаў мне Матэвуш, адзін з удзельнікаў пікета.

Апрача бел-чырвона-белых сцягоў удзельнікі трымалі ў руках лозунг „Дапамажы ваюючай Беларусі!" Прадстаўнікі ЗДБ перадалі дэпутатам ліст, у якім заклікалі да больш рашучай рэакцыі на палітыку Аляксандра Лукашэнкі. „Прыйшоў ужо час стануць твар у твар з беларускай праблемай і шчыра адказаць на пытанне: ці несправядлівасць, якая адбываецца побач нас, і да якой мы абыякавыя, не робіць таксама з нас віноўнікаў?" — чытаем у лісце. У час пікета даведаўся я пра іншыя акцыі ЗДБ.

— Зімою, калі было мноства снегу, вытапталі мы пад пасольствам Беларусі вялікі лозунг „Жыве Беларусь", — усміхаючыся сказаў мне Тамаш Лапата, родам з Варшавы.

... ды Асабісты Дзень Волі

Апрача афіцыйных святкаванняў 25 Сакавіка адбыліся таксама больш камерныя. Увечары на кватэры Ілоны Карпюк — старшыні БАС, сабралася пару падляшскіх беларусаў. Здаецца, была гэта найбольш асабістая частка святкаванняў Дня Волі. Сябры сустрэліся, паслухалі патрыятычных песень, самі паспявалі — і чалавек падбадзёрыўся. Некалькі месяцаў таму нехта запытаў мяне, ці ёсць нейкі асяродак, які гуртуе беларускае падляшскае асяроддзе ў Варшаве. Цяпер яму адказваю — ёсць!

Святкаванні 25 Сакавіка ў Варшаве не закончыліся ў гэты дзень. Яшчэ і 26 сакавіка ў рамках Беларускіх дзён на Варшаўскім універсітэце адбыліся даклады Аляксея Дзікавіцкага і Артура Клінава (арганізатар — Інстытут беларускай культуры ў Варшаве) ды паказ фільмаў з Беласточчыны, арганізаваны БАС пры дапамозе Дыскусійнага фільмавага клуба „Pod spodem".

Міхась Сцепанюк

З мінулага Бацікаў

Маёнтак у Бацікаў-Сярэдніх існаваў ужо ў XV стагоддзі. Першымі вядомымі ў гісторыі ўладальнікамі гэтай вёскі былі Шчыты, тыя ж, што трымалі між іншым маёнтак у Шчытах-Дзенцялове. Пазней уладалі маёнткам Ізыковічы, Асалінскія, а ў пачатках XIX стагоддзя Бацікі сталі ўласнасцю роду Цяцерскіх. Перадапошні ўладальнік маёнтка Генрык Цяцерскі заснаваў фабрыку кілімаў, якая выкарыстоўвала ткацкі вопыт мясцовых сялянак і выпускала модныя ў тадышняй Польшчы айчынныя вырабы ўпрыгожаныя ўзорамі пачэрпнутымі з народнай традыцыі. Кілімы з Бацікаў-Сярэдніх карысталіся такой папулярнасцю як і двухасновавыя дываны з іншых раёнаў Беласточчыны, толькі былі таннейшыя і больш даступныя пакупнікам. Фабрычная прадукцыя пераважна прадавалася за граніцу.

Марыя Врублеўская, 90-гадовая жыхарка Бацікаў, была адной з лепшых работніц на фабрыцы Цяцерскіх. Наведаў я старажылку ў яе невялікім драўляным доміку пасярэдзіне вёскі, у якім, пасля смерці мужа і выхаду траіх дзяцей у свет, жыве адзінока. У чыстым, утульным пакоіку, пры цёплай кафляной печы сядзіць спадарыня Врублеўская, якую ў вёсцы завуць Вароб'іха, ды спявае малітвы з Багагласніка — акурат пачаўся Вялікі пост. Калі я растлумачыў мэту свайго візіту, аблічча жанчыны пасвятлела ад успаміну аб той далёкай ужо маладосці.

— Мне ўжо дзевяноста гадоў, — расказвае спадарыня Врублеўская. — Нарадзілася я ў 1914 годзе. У нашай сям'і з дзесяці народжаных дзяцей выжыла толькі сямёра. У Бацікаў была польская школа і я ў ёй вучылася. У той жа школе вучыўся мой пазнейшы муж, Янак і — як пазней аказалася — ужо тады ўпадабаў мяне на сваю жонку. Пан Цяцерскі добра ведаў майго бацьку Міхала Турчука. Калісь пан прыехаў да нас, а я акурат пабегла за бацькам і тады дзедзіц пабачыў мяне. У дзяцінстве я праўдападобна была вельмі прыгожая і спадабалася Цяцерскаму, дзякуючы чаму ён дазволіў мне вучыцца ткацтву на яго фабрыцы. За ткацкім станком стала я ў трынаццацігадовым узросце і пачала зарабляць грошы, якія вельмі прыдаваліся бацькам. З часам я набыла больш умеласцей і стала лепш зарабляць.

Марыя Врублеўская сапраўды была шанаванай ткалляй, аб чым сведчыць факт, што выслалі яе з кілімамі на выстаўку мастацкага рамяства ў Вольны Горад Гданьск.

— На фабрыцы працавала больш за трыццаць чалавек, але ў Гданьск паслалі менавіта мяне. Другі раз такі гонар сустрэў мяне, калі была я выслана ў Беласток. Там меў паўстаць філіял нашай фабрыкі і я мела прывучаць тамашніх дзяўчат тканню кілімаў. Але жыццё ў горадзе мне не адпавядала — шум, гармідар, поўна чужых людзей. Аднойчы ўзяла я свой чамадан з рэчамі і ўцякла дадому. Нейкая жанчына, якую я сустрэла ў цягніку, ехала ў Мілейчычы. Я прыехала разам з ёю, а ў Бацікі пайшла сама, бо ведала дарогу.

Пазней спадарыня Врублеўская выйшла замуж, нарадзіла і выхавала дзяцей, сёння ў яе ўжо дарослыя ўнукі. У пасляваенныя гады нейкі час старшынявала Гуртку вясковых гаспадынь і давяла да таго, што ў Бацікаў-Сярэдніх адбылася ўрачыстасць пасвячэння вясковай святліцы. Час ад часу ў святліцу прыязджае бацюшка з Сямятыч служыць нядзельныя акафісты.

Марыя Врублеўская ўражвае не толькі дасканалай памяццю, багатай у лексіку мовай, але і рэдкай уродай старых твараў — відаць, што сапраўды калісьці была прыгожай жанчынай.

Няхай Гаподзь дасць ёй яшчэ многія леты!

М. Ц.

Наша Нараўка

Перад 1639 годам на правым беразе рэчкі Нараўкі Тамаш Выдра-Палікоўскі заснаваў рудню. Неўзабаве вакол яе паўстала асада, якую ад назвы рэчкі назвалі Нараўкай. У некаторых крыніцах успамінаецца, што заснавальнікам Нараўкі быў Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

У XVII стагоддзі Нараўка належыла Фёдару Масальскаму, які пачаў каланізацыю гэтых абшараў. Сапраўднае развіццё вёскі пачалося ў 70-х гадах XVIII стагоддзя пасля ўпарадкавання Антонім Тызенгаўзам лясной гаспадаркі. Нельга ўжо было свабодна ўваходзіць у пушчу, секчы лес і таму развілася пушчанская прамысловасць: гуты шкла, смалярні, шкіпінарні.

Нараўка, распаложаная на ўскраіне Белавежскай пушчы, над сплаўнай рэчкай, на мяжы камунікацыйных шляхоў з Гродна і Пружан, была выгадным месцам для звозкі пушчанскіх прадуктаў і транспарту іх Нараўкай да Нарвы. Прадбачвалася ёй функцыя гарадка, які б услугоўваў людзям, з'явіўшымся тут у сувязі з гандлем драўнінай.

У Нараўцы можна было выдзеліць тры зоны: мястэчка, фальварак і вёску Нараўку.

У 1805 годзе ў Нараўцы былі дзве вуліцы. Беластоцкая (цяпер Гайнаўская) вяла да пераправы цераз раку і спалучалася з вуліцай Пружанскай, якая была фрагментам тракту Пружаны — Гродна. Праз раку перакінуты быў вялікі, драўляны мост, ля якога знаходзіўся млын і хата млынара. У канцы Беластоцкай вуліцы стаяў касцёл уфундаваны ў 1777 годзе Станіславам Аўгустам, які ў 1793 годзе падараваў касцёлу вёску Заблоччыну. Па вуліцы Пружанскай была плябанія з агародам, непадалёк быў дом сталяра, карчма, стайні, адрыны, бровар, фальварак і іншыя будынкі. Вуліца ў цэнтры была абсаджана дрэвамі. Непадалёк быў дзядзінец з прыгожым чатырохпакаёвым будынкам, кухонны флігель з трыма пакоямі. Непадалёк была стайня, вазоўня і свіран. Былі два калодзежы. Вакол дзядзінца стаялі ўсе неабходныя будынкі: хлеў, сушыльня, пякарня і г.д.

У фальварачнай Нараўцы жыло 11 сем'яў, кожная з іх мела па 5 валок зямлі. У 1808 годзе фальварак Нараўка ўзялі ў арэнду Сцяпан і Марыянна Карчэўскія, а ў 1844 годзе пераходзіць ён ва ўладанне дзяржавы. У першай палове XIX стагоддзя Нараўка была мястэчкам.

Школа ў Нараўцы (сучаснасць)

У 40-х гадах XIX ст. у вёску пачалі прыязджаць яўрэі, галоўным чынам з Орлі і Пружан. Мела гэта ўплыў на развіццё Нараўкі. Да 1845 года яўрэі заснавалі: 4 кравецкія, 2 кавальскія, 2 фарбавальныя, 3 гарбарскія, 2 шклярскія, 1 цырульны, 1 бондарскі, 1 ганчарскі, 1 кушнерскі цэхі. Большасць магазінаў належала таксама ім. Былі тут: карчма, піўны бар, пякарня, магазін з адзеннем, оптавы гандаль півам, піяльня гарбаты, галантарэя і многа іншых. У 1879 годзе ў Нараўцы пражывалі 863 асобы, у тым ліку 778 яўрэяў. Па вуліцы Школьнай знаходзілася яўрэйская малітоўная школа, бажніца і яўрэйская лазня. На ўзгорку за Нараўкай паўстаў кіркут. Паўставалі новыя вуліцы.

Пасля Студзеньскага паўстання, у 1866 годзе каталіцкі касцёл быў пераўтвораны ў праваслаўную могільнікавую капліцу. У 1865 годзе ў паркавай частцы фальварка пачалася будова праваслаўнай царквы. Паўстала яна з ахвяраванняў прыхаджан і дапамогі рускага ўрада. Яе пабудова закончылася ў 1867 годзе.

У 1906 годзе Нараўка атрымала чыгуначнае спалучэнне з Гайнаўкай і Ваўкавыскам. Было тут таксама прамысловае прадпрыемства па прадукцыі шкла. У 1909 годзе пры вырабе крышталю, лямпачак, шкла для аптэк працавала каля 135 чалавек.

У 1911 годзе на другім беразе ракі Нараўкі пачалі будову касцёла.

Вялікі ўплыў на жыццё праваслаўных жыхароў Нараўкі мела I сусветная вайна. Шчасліва аднак склалася, што збудаванні не былі разбураны. У 1914 г. пачалася мабілізацыя ў рускую армію. Людзі баяліся немцаў, якія, паводле царскай прапаганды, мелі здзекавацца над жыхарамі. У 1915 годзе рускія ўлады распачалі эвакуацыю людзей. Праваслаўныя духоўныя заклікалі ўцякаць з вёскі і пакідаць свае гаспадаркі. Праз Нараўку праходзіў шлях бежанцаў, якія праз Белавежскую пушчу і Пружаны ўцякалі ў глыб Расіі. Сведчаннем бежанства і ўдзелу жыхароў у вайне з'яўляюцца крыжы парафіян вакол царквы ў Нараўцы.

У 1921 годзе Нараўка налічвала 1 200 жыхароў і 174 будынкі. У згодзе побач сябе жылі беларусы, палякі, яўрэі. Нараўка была таксама адным з асяродкаў рэвалюцыйнага руху кіраванага КПЗБ. Жыхары Нараўкі прымалі актыўны ўдзел у забастоўках і выступленнях супраць буржуазных улад. Здараліся таксама партызанскія змаганні беларускіх атрадаў за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. У Нараўцы сваю дзейнасць разгарнула таксама Грамада.

У 1938 годзе пабудавалі тут новую школу, якая была найпрыгажэйшай ва ўсёй ваколіцы. У памяці вучняў засталіся прозвішчы многіх настаўнікаў, якія з вялікай адданасцю і сэрцам перадавалі веды сваім навучэнцам.

У 1939-1944 гг. Нараўка ўваходзіла у састаў Савецкай Беларусі. У час вайны ў Нараўцы быў нямецкі штаб і таму вёска не была спалена ці разбурана. У жніўні 1941 г. у лесе непадалёк вёскі Заблоччына ўсіх хлопцаў і мужчын яўрэяў (разам 281 асоба) гітлераўцы расстралялі, 421 жанчыну і дзяцей перасялілі ў Кобрын і Пружаны.

У пазнейшы час засыпалі адгалінаванне ракі Нараўкі, якая разам з галоўным рэчышчам утварала невялікі востраў ля самага моста, размецілі таксама новую дарогу, якая абмінала даўнія могілкі.

Зараз Нараўка самая вялікая вёска ў гміне, у якой пражывае 988 чалавек. Тут працуюць Пачатковая школа і Гімназія, Гмінны асяродак культуры, бібліятэка, Гмінная ўправа, пажарная каманда, паліцыя, асяродак здароўя, пошта, пякарня, магазіны і пагранзастава.

У Нараўцы нарадзіліся і жылі Тамара Саланевіч і Аляксандр Валкавыцкі, якім блізкія былі справы беларускага народа. У 1972 годзе Пачатковай школе прысвоілі імя Аляксандра Валкавыцкага, а ў 2000 годзе Публічнай гімназіі — імя Тамары Саланевіч. Дзякуючы гэтым людзям вучні зразумелі, што ажыццяўляць мары і рабіць кар'еру можна не толькі ў вялікім свеце, але тут, дзе нашы карані — наша малая айчына.

Нараўка гэта невялікая, але вельмі прыгожая мясцовасць, праз якую праплывае аднайменная рэчка. У ёй вельмі чыстая вада і таму летам сюды прыязджаюць з усёй ваколіцы людзі, якія хочуць пакупацца і адпачыць.

Інфармацыі сабралі
Наталля Раманчук і Святлана Дрозд,
Гімназія ў Нараўцы

Люблінская унія

(заканчэнне; пачатак у папярэднім нумары)

Частка II

Пасля Люблінскай уніі, пад канец XVI і ў першай палове XVII стагоддзяў развінулася матэрыяльная і духовая культура беларускага народа. Узніклі шматлікія архітэктурныя помнікі ў рэнесансным і барочным стылі, пачалі працу новыя друкарні, развінулася шкляная прамысловасць.

Развінулася сакральнае мастацтва. Узнікалі мастацкія майстэрні пры манастырах або будучыя прыватнай уласнасцю працуючых у іх мастакоў. У гэтых майстэрнях ствараліся іконы, якія ўпрыгожвалі храмы розных веравызнанняў. Пачынаючы з XVI стагоддзя іконы, якія пісаліся ў мастацкіх майстэрнях, набывалі характэрныя рысы ўсяму сакральнаму мастацтву Беларусі. Гэтае мастацтва падвяргалася розным творчым уплывам, якія ішлі са славянскіх краін і з захаду Еўропы. Яшчэ ў XVII стагоддзі іканаграфія на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага захоўвае вернасць канонам і традыцыям усходняга сакральнага мастацтва. Тадышнія іконы вылучаліся высокім узроўнем духовасці і сціпласцю мастацкіх прыёмаў. Прычынай гэтаму было імкненне захаваць уласную традыцыю ды рэлігійную і нацыянальную тоеснасць. У XVIII стагоддзі іканаграфія стала люстэркам палітычнага канфлікту гэтага часу. Значную ролю ў сфармаванні XVIII-вечнага іканаграфічнага мастацтва ў Вялікім княстве Літоўскім адыграла народнае мастацтва. З мастацкіх майстэрняў на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ў XVI-XVIII стагоддзях выйшлі іконы, якія вылучаліся арыгінальнасцю і незалежнасцю творчай думкі мясцовых іканапісцаў. Гэта засведчвае аб існаванні самастойнай школы сакральнага мастацтва на беларускіх землях. Яе характэрнымі рысамі былі, між іншым, эмацыйнасць, непасрэднасць, яркасць колераў, замілаванне да арнаменталістыкі і набліжэнне да фальклору. Самай частай выявай у XVII стагоддзі стала Божая Маці. Тэма Страшнага суда ўвогуле адсутнічала ў беларускіх рэлігійных абразах, а біблейным сюжэтам мастакі прыдавалі мясцовыя рэаліі.

У свецкім мастацтве з канца XVI стагоддзя да канца Рэчы Паспалітай пераважаў партрэтны жывапіс.

У першай палове XVII стагоддзя істотныя перамены адбыліся таксама ў беларускай архітэктуры. У гарадскім будаўніцтве наглядаўся адыход ад сярэдневечных пабудоў на плане кола ў карысць рэгулярнай планіроўкі ў прамавугольных кварталах з забудаванымі гандлёвымі плошчамі. У манументальнай архітэктуры адбыўся абмежаваны сінтэз італьянскіх узораў і мясцовых традыцый.

Арыгінальныя і дынамічныя шматпавярховыя кампазіцыі, якія спалучалі ў сабе рэнесансныя і барочныя рысы, паўставалі таксама ў драўлянай народнай архітэктуры. Праніканне барочнага стылю ў традыцыйнае будаўніцтва давяло да ўзнікнення новага тыпу храма — двухзрубнай базілікі з плоскім фасадам. Адбыліся таксама значныя змены ў інтэр'еры і ў форме даху гэтых храмаў. Захаваныя прыклады драўляных цэркваў Віцебшчыны і Палесся сведчаць аб тым, што стварыліся там асобныя, характэрныя толькі той тэрыторыі тыпы архітэктуры. Таксама своеасаблівыя формы ўзніклі ў XVII стагоддзі ў праваслаўнай архітэктуры Магілёўшчыны, дзе будаваліся цэрквы ў барочным стылі. Зусім нетыповымі ў Беларусі былі элементы вялікарускай царкоўнай архітэктуры: какошнікі, цыбулепадобныя купалы вежаў, прыбудоўкі.

У Вялікім княстве Літоўскім, пасля прыняцця III Літоўскага статута, пашырылася магдэбургскае права, узмацніліся гандлёвыя сувязі з Ганзейскім саюзам, Венецыяй і Нідэрландамі. На пачатку XVII стагоддзя вернуты быў Смаленск, а яшчэ раней — Гомель. Тэрыторыі ўплываў беларускага народа зноў перасунуліся на ўсход і замацаваліся там да 1919 г. Нягледзячы на пазнейшы некарысны ход падзей (канчатковы захоп Смаленска Маскоўскай дзяржавай у палове XVII стагоддзя, Паўночная вайна і вайна 1812 г., якія агнявым валам пракаціліся па ўсходняй Беларусі), этнічная мяжа беларускага народа на пачатку XX стагоддзя пралягала на ўсход ад Смаленска, Бранска, Невеля, Севера і Усвятаў.

Такім чынам, згаджаючыся ў Любліне на пэўныя абмежаванні сваёй незалежнасці і значную страту сваёй тэрыторыі, Вялікае княства Літоўскае змагло застацца дзяржавай са сваёй фінансавай сістэмай, эканомікай, войскам і, самае галоўнае, са сваёй культурай, мовай і менталітэтам, аж да III падзелу Польшчы ў 1795 годзе.

Пятро Хомік

Фронт у многім страціў пазіцыі, але не знік...

www.pbnf.org

Сучаснае палітычнае жыццё Беларусі складанае і неадназначнае. А ўся гэтая складанасць і неадназначнасць мае свой пачатак напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Менавіта тады ў самы разгар „перабудовы" на гістарычную арэну беларускай дзяржавы (тады яшчэ часткі СССР) выйшаў і заявіў аб сабе Беларускі народны фронт. Далейшыя перыпетыі нацыянальна-адраджэнскага руху прывялі да таго, што Фронт у многім страціў свае раней заваяваныя пазіцыі ў палітыцы краіны. Але нельга казаць аб яго знікненні. Партыя БНФ па-ранейшаму з'яўляецца адной з моцных палітычных арганізацый Беларусі, мае непахісных сяброў і прыхільнікаў, а таксама сайт у Інтэрнэце.

Галоўная старонка сайта, цікава названая „Перадусім", адкрывае магчымасць пазнаёміцца з апошнімі навінамі ў жыцці БНФ, а таксама стаўленні партыі да розных падзей палітычнага жыцця Беларусі. Варта адзначыць, што ў адрозненні ад „навінных" сайтаў тут інфармацыі падаюцца ў выглядзе невялікіх артыкулаў, якія цалкам перадаюць змест паведамлення, без дадатковага пераходу на больш падрабязную інфармацыю. Навіны на старонцы „Перадусім" абнаўляюцца даволі часта. Ранейшыя паведамленні, у рэшце рэшт, аказваюцца ўнізе старонкі, навідавоку ад іх застаюцца толькі загалоўкі, а потым увогуле перамяшчаюцца ў архіў.

Што ж тычыцца непасрэдна „Архіва", то пазнаёміцца ў ім з паведамленнямі ранейшымі за кастрычнік мінулага года не так лёгка.

Калі паглядзець на верхні правы куток галоўнай старонкі, то там можна ўбачыць адразу ўсе рубрыкі сайта. Другой ідуць „Навіны". Чым яны адрозніваюцца ад „Перадусім" — невядома, я не знайшоў ніводнага непадабенства.

Рубрыка „Праграма і статут" даюць магчымасць пачытаць галоўныя дакументы Фронту, даведацца пра арганізацыйную будову арганізацыі, яе ідэалагічныя ўстаноўкі.

А вось з „Гісторыяй" БНФ не ўсё так проста. Клікнуўшы на гэтую рубрыку, на вашым маніторы з'явіцца адрас гэтай самай гісторыі на англійскай мове. Дзіўна тое, што на беларускай мове даведацца аб мінулым Фронту карыстальніку чамусьці нельга — няма ні арыгінала, ні хоць бы перакладу з англійскай.

Рубрыка „Сымболіка" дае магчымасць убачыць эмблему і сцяг БНФ, а „Кантакты" — кіраўніцтва як вышэйшае, так і паасобных рэгіёнаў.

Аб тым, што піша пра Народны фронт прэса, можна даведацца праз адпаведныя спасылкі, якія размешчаны на правым баку галоўнай старонкі. Там, дарэчы, знаходзіцца і банэр створанай не так даўно дэмакратычнай апазіцыйнай кааліцыі „5+", куды, зразумела, уваходзіць БНФ. Таксама карыстальнік мае магчымасць задаць пытанне і прыняць удзел у маладзёжных дыскусіях, якія, як сведчыць іх банэр, кожны чацвер адбываюцца ва Управе БНФ.

З левага боку знаходзяцца выхады да інфармацый аб рэгіянальных арганізацыях партыі — яны дазваляюць адразу пазнаёміцца з якім-небудзь актывістам БНФ у беларускай глыбінцы. Ніжэй рубрыка „Структуры" падае даныя пастаўленых на юрыдычны ўлік усіх, нават самых драбнюткіх суполак Фронту як партыі, так і грамадскага аб'яднання. Такая дваістасць адной і той жа арганізацыі паўстала з-за асаблівасцей беларускай прававой сістэмы.

Пазнаёміўшыся з сайтам, прыходзіш да высновы, што не ўсё так дрэнна для развіцця дэмакратыі ў Беларусі, калі той жа БНФ быў, ёсць і, праўдападобна, будзе.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларускія спартсмены ад Хельсінкі да Афінаў

Беларусь, беларусы...

1996 — Атланта
(15 медалёў)

Упершыню ў гісторыі Беларусь узяла ўдзел у алімпіядах як незалежная краіна. Гульні для беларусаў выдаліся не надта ўдалымі. Па медальным заліку (у разлік тут бярэцца не толькі колькасць, але і вартасць медалёў) нашы суайчыннікі занялі толькі 37-е месца сярод усіх краін (чатыры гады таму ў Барселоне было неафіцыйнае 9-е). Зрэшты, у больш аб'ектыўнай класіфікацыі, дзе ўлічваюцца восем першых месцаў, ва ўсіх дысцыплінах, беларусы сталі васемнаццатымі, зусім крыху адстаўшы ад Вялікабрытаніі. Асноўныя здабыткі былі на рахунку барцоў, жанчын-вясляраК і лёгкаатлетаў. А вось штангісты, на якіх ускладаліся значныя спадзевы, выступілі абсалютна правальна. Іншая прыкрасць — беларусак цынічна засудзілі ў мастацкай гімнастыцы.

Усяго на агульным балансе беларусаў было 15 медалёў (патлумачым, што ў камандавым веславанні ажно дзевяць медалістак, але адно прызавое месца ў агульны залік). Першы суверэнны залаты (адзіны вышэйшай пробы на гэтай алімпіядзе для Беларусі) медаль заваявала **Кацярына Хадатовіч** у лодцы-адзіночцы. Бронзу беларускія вясляркі выйгралі ў акадэмічнай васьмёрцы — **Наталля Лаўрыненка**, **Аляксандра Панькіна**, **Наталля Волчак**, **Тамара Давыдзенка**, **Валянціна Скрабатун**, **Алена Мікуліч**, **Наталля Стасюк**, **Марына Знак** і рулявая **Яраслава Паўловіч**. Асабліва радавалася 35-гадовая Марына Знак, для якой атланцкая алімпіяда была апошняй.

Срэбранымі лаўрэатамі сталі барцы грэцка-рымскага стылю **Аляксандр Паўлаў** (найлягчэйшая катэгорыя да 48 кг) і **Сяргей Ліштван** (вага да 100 кг, у фінале 0:0 з алімпійскім чэмпіёнам Сеула Анджэем Вронскім, суддзі аддалі перавагу паляку толькі за кошт большай актыўнасці), барэц-вольнік **Аляксей Мядзведзеў** (суперцяжкая катэгорыя да 130 кг), стралок **Ігар Басінскі** (практыкаванне з адвольнага пісталета), дыскабол **Уладзімір Дуброўшчык** (гарадзенец саступіў толькі славутаму немцу Ларсу Рыдэлю), сяміборка **Наталля Сазановіч** (адзін з найпрэстыжнейшых відаў лёгкай атлетыкі).

Бронзавымі медалямі былі ўганараваны барэц-класік **Валерый Цыленць** (вага да 82 кг, пры тым выхаванец Лідскай школы атлетаў разграміў з лікам 10:0 чэмпіёна свету расіяніна Сяргея Цвіра), дыскаболы **Васіль Капцюх** і **Эліна Зверава**.

Чатыры (!) бронзавыя медалі заваяваў шасціразовы алімпійскі чэмпіён **Віталь Шчэрба** (шматбор'е, практыкаванні ў апорным скачку, на брусах і папярэчыне). Большага дасягнуць не дазволілі арбітры. Што і казаць, сучасная гімнастыка — від не столькі спартовы, колькі судзейскі. Мажліва, перашкодзілі і жыццёвыя нягоды. У часе між алімпіядамі жонка Шчэрбы Ірына трапіла ў жахлівую аўтааварыю, славуты гімнаст патраціў вялізныя грошы і з дапамогай лекараў вярнуў яе літаральна з таго свету. Шчэрба ўжо даўно жыве ў Амерыцы (шлях бальшыні беларускіх гімнастаў-чэмпіёнаў — ім пайшлі Вольга Корбут, Алена Ваўчыцкая, Нэлі Кім, Святлана Багінская), мае там сваю прыватную гімнастычную школу. Знакаміты чэмпіён толькі зрэдку прыязджае на радзіму, ён прыкметна набраў вагі і выглядае гэткім бізнесоўцам-босам. Не так даўно Шчэрба зняўся ў адным з расійскіх тэлесерыялаў, тым не менш сваёй радзімай лічыць Беларусь.

З'ехала за мяжу і першая суверэнная алімпійская чэмпіёнка Кацярына Хадатовіч. Пасля атланцкай алімпіяды яна выйшла замуж за немца, нарадзіла дзіця. Пасля пэўнага перапынку Кацярына выступае пад прозвішчам Карстан, але па-ранейшаму на розных спаборніцтвах заваёўвае медалі і славу для Беларусі.

Падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Занатоўкі кантрабандыста

Вясёлая забава

Ночка па ўсіх прыкметах мусіла выдацца цёплай. Расклаўшы невялічкі агеньчык, кантрабандысты, пасля цяжкой працы, валяліся на зямлі, як свінні ў балоце. Такія летнія вечары заўсёды праходзяць пад аповеды. Найцікавей калі знаходзіцца весялун, у якога безліч цікавых гісторый. Тады ў размовы ўцягваюцца нават такія людзі, якія спярша падаюцца маўчунамі. Юрка з-пад Свіслачы выглядаў на такога. Таму, як ён пачынаў гаварыць, усе з цікавасцю замаўкалі. Бо той мог расказаць штосьці такое, пра што іншыя не адважваліся. У кантрабандыстаў ёсць некалькі забабонаў. Прыкладам, не гаварыць пра сваіх жанчын. Кантрабандысты вечна за мяжой. А чым у гэты час займаюцца іх жанчыны? Адным словам, лепш памаўчаць, каб не накаркаць якой бяды. Бо хтосьці кахае сваю жанчыну, іншы пакутуе, што ягоная транжырыць заробленыя непасільнай працай грошы. У кожнага свая прычына. А для Юркі ніякіх табу не існавала. Яго першае каханне закончылася катастрофай і з тае пары ён увогуле ўзненавідзеў усіх жанчын разам і кожную асобна. Нават сваю жонку. Маліў лёс толькі пра адно — каб у яго былі толькі сыны. Лёс яго не слухаў: падарыў трох прыгожых дачок. Тады Юрка цалкам прысвяціў сябе працы. Увесь час штосьці камбінаваў, быў аўтарам некалькіх грандыёзных праектаў. Адзін з іх — пракапаць тунель пад польска-беларускай мяжой. Не ўдалося. Забракла аднадумцаў. Тады ён падняўся вышэй. Вырашыў пераляцаць мяжу на дэльтаплане. Ды першая ж спроба скончылася паламанымі касцямі, пасля чаго Юрка зацікавіўся воднымі шляхамі. Стаў у пластмасавых пакетах сплаўляць спірт па Нёмане ў Літву. Там яго кампаньён вылоўліваў тавар з ракі. Але мясцовыя алкаголікі хутка пранюхалі пра гэта і цэлымі днямі сядзелі ў вадзе, чакаючы калі з Беларусі прыплыве што выпіць. Радасці ад гэтага было толькі жонкам тых алкаголікаў. Яны думалі што іх мужыкі нарэшце кінулі піць і заняліся плаваннем. А для Юркі гэта была трагедыя. Ды не збіраўся ён здавацца. Пачуў неяк, што Аўгустоўскі канал адновяць. Сабраў матэрыялы пра гэты канал, разлічыў хуткасць цячэння, прыдумаў як спірт будзе пераплываць праз шлюзы. Нават напісаў просьбу на трыццаці сямі лістах у парламент Беларусі, каб хутчэй Аўгустоўскі канал адчынілі. Маўляў, гэта мае неверагодна вялікае значэнне для культурных сувязяў. Ды ці ліст не дайшоў, ці сродкаў забракла. Канал так і не запрацаваў. А Юрку зноўку прыйшлося карыстацца старымі дзедаўскімі метадамі, хаваючы спірт дзе папала. З тае прычыны ён яшчэ мацней палюбіў сваю працу і спірт і, чамусьці, яшчэ мацней узненавідзеў жанчын. Няведама з чаго лічыў іх прычынай усіх сваіх паразаў.

— Неяк піў я тры дні ў Саколцы, у Чэслава Вароніча, — распачаў сваю гісторыю Юрка. — На чацвёрты сабраў што не паспелі праглынуць і паехаў у Беласток. Надвор'е было — нібы жыд застрэліўся. Мокры снег, галалёд, вецер. А тут нейкая баба махае рукамі, просіць каб падвёз. Хлопцы, вы ж ведаеце як я іх ненавіджу, гэтых баб. А ў той яшчэ боты на высокіх абцасах, як у дзяўчыны, якую я кахаў. Такія боты цярпець не магу. Дай думаю напалохаю яе чым. Спыніўся. Падвязу, кажу, але пры ўмове, што пазабаўляюся табой прама на снезе. Думаю, хай спалохаецца, што я маньяк.

— На снезе? — перапытвае яна. — Як цікава! Ніколі ў жыцці такога не мела. Трэба паспрабаваць, — і шась да мяне ў машыну.

Я еду паціху, маўчу. Пра што мне гаварыць з бабай? А яна пытае:

— Як мы доўга будзем забаўляцца на снезе?

— Пакуль не замерзнеш.

— Ну то значыць доўга. Тады едзь хутчэй, каб усё паспець. А то мне праз чатыры гадзіны трэба быць на вакзале ў Беластоку. Мужа сустракаю з камандзіроўкі.

Ну, думаю, гадзюка, паеду так хутка, што з цябе дух выскачыць. Ды вось бяда. Перада мной два аўтобусы стукнуліся. Усю дарогу загарадзілі. Яшчэ і паліцыя прыехала. Націснуў я на тармазы і пачало круціць маю машыну. Памятаю толькі як з-пад бампера польскі паліцыянт нырануў у кювет, галавой у снег. А машына праляцела над ім у поле, і ляснулася аб зямлю так, што ўсе бутэлькі са спіртам пабіліся. Паліцыянт ускочыў, ляціць звар'яцеўшы да мяне. Шапку поўную снегу надзябурыў на башку і раве, каб я выходзіў. А я па калена ў спірце, ды яшчэ п'яны. Як я выйду? Зачыніў усе дзверы і раблю выгляд што не бачу нікога. А дзеўка не шавеліцца, сядзіць белая як смерць. Я падумаў, што яна дала дуба. Можа сэрца разарвалася ад перапалоху. Вельмі стала мне шкода сябе. Пасадзяць жа ў турму. Адна радасць — там баб не будзе. А больш за ўсё шкада было пабітага спірту.

Як толькі паліцыянт заняўся аўтобусамі, я ўпрасіў людзей выпіхнуць мяне на дарогу і ходу адтуль. І тут ажыла гэтая дзеўка. Стала раўсці, лямантаваць, адчыніла дзверы і хоча выскачыць. Але пас не пускае. А як я ўзяў нож, каб перарэзаць той пас — зноў самлела. Я паляпаў ёй па твары. Гляджу — ажыла. Жывучыя яны. Выйшла з машыны і кажа:

— Ну і падвёз ты мяне!

— Затое як добра пазабаўляліся, — весела адказаў я, і паехаў назад вельмі задаволены, што ўрэшце атрымалася яе напалохаць. І халера з ім, з тым разбітым спіртам.

Сымон Нальшанскі

ПАЎЛІНА РАІЦЬ

У апошні час у сродках масавай інфармацыі многа месца адводзіцца з'яве дыскрымінацыі на месцы працы. Дыскрымінацыя праследуецца кодэксам працы нядаўна, ад пачатку гэтага года. Не абазначае гэта, што раней такая з'ява не мела месца. Прыкладаў можна прывесці многа, але людзі ад страху страціць працу, пры так вялікім беспрацоўі, не супраціўляюцца зняважлівым адносінам шэфа... Але з уваходам Польшчы ў ЕС і прыстасаваннем кодэкса працы да еўрапейскіх норм, варта ведаць, якія правы прыслугоўваюць працоўным!

Да 1.01.2004 г. артыкул 11^3 кодэкса працы (старая версія, яшчэ да навелізацыі) забараняў дыскрымінацыю па прычыне полу, узросту, інваліднасці (абмежаванасці працаздольнасці), расы, веравызнання, нацыянальнасці, палітычных поглядаў і прафсаюзнай прыналежнасці. Пасля навелізацыі, з 1.01.2004 г., гэты каталог папоўніўся этнічным паходжаннем, сексуальнымі схільнасцямі, занятасцю на акрэслены і неакрэслены час у поўным і няпоўным вымярэнні часу працы. Дадаць трэба, што каталог не з'яўляецца замкнутым. Абазначае гэта, што можа ён папаўняцца новымі прычынамі дыскрымінацыі. Прыкладам можа тут быць пытанне, якое часта ставіцца шукаючым працу, пра грамадзянскі стан і колькасць дзяцей.

Кодэкс накладае на шэфаў прадпрыемстваў абавязак роўнага трактавання ўсіх супрацоўнікаў. Гэта павінна даваць работнікам гарантыю псіхічнай стабільнасці. Як гэта павінна выглядаць на практыцы? Напэўна шэф не можа адносіцца да аднаго работніка горш чым да іншых, напрыклад, толькі таму, што гэта жанчына (быццам слабейшы пол!), або іншаверац.

Дыскрымінацыя праяўляецца ў наступных формах:

— працадаўца не хоча падпісаць або развязаць дамову на працу (напр., па прычыне маладога або сталага ўзросту);

— прад'яўленне работы на іншых, як астатнім супрацоўнікам, умовах;

— ніжэйшая зарплата, чым устаноўлена для канкрэтнай працы і пасады (напр., з-за інваліднасці);

— не прызнаванне прэміяльнага і дадаткаў звязаных з працай, абмінанне пры павышэннях і накіраваннях на курсы дасканалення прафесійных здольнасцей (напр., пасыланне на курсы толькі штатных працаўнікоў, бо працадаўцу аплачваецца такая доўгатэрміновая інвестыцыя).

Галоўнай праблемай пакрыўджанай асобы, якая ўжо рашыцца адстойваць свае правы перад судом, будзе пераканаць суд аб віне працадаўцы. Да гэтага трэба адпаведна падрыхтавацца. Да 1.01.2004 г. кампенсацыя пакрыўджанаму работніку магла максімальна скласці шасцікратнасць мінімалкі (якая складае 824 зл.). Пасля навелізацыі можна патрабаваць любую кампенсацыю, але канчатковае рашэнне належыць суду. Нельга атрымаць менш чым мінімальная зарплата.

Дыскрымінацыя нічога не дае працадаўцу, бо запалоханы супрацоўнік не мае ахвоты да працы! Дыскрымінаваная асоба можа ў выніку стрэсу папасці ў цяжкую псіхічную хваробу, набавіцца дэпрэсіі і язваў. Паводле вынікаў найноўшых даследаванняў, дыскрымінаваныя на працы асобы набываюць сіндром посттраўматычнага стрэсавага разладжання, роўны псіхічным траўмам, якія спазналі ахвяры вайны або вязні канцлагераў. Памятайма — дыскрымінацыя на працы бывае горшай чым насілле дома!

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Доля пенсіянера

Прачытаў я ў „Ніве" № 9 ад 29 лютага г.г. невялікі допіс (ус) „Хто мае грошы" і моцна над ім задумаўся. Аўтар допісу праўду кажа, што для статыстыкі павінен быць давер, і я з тым згодны, але не да канца. Некаторыя апазіцыйныя палітыкі нашу мінуўшчыну прывыклі называць камунай, а цяперашнюю ўладу — посткамунай. Пры камуне дзеці сялян, якім бацькі перадалі свае гаспадаркі, гаварылі, што лепш „гадаваць" у хаце аднаго пенсіянера, чым у хляве адну карову. У той час пенсіянеры атрымлівалі ўсе лякарствы дармовыя. Цяпер, калі верыць статыстыцы, пенсіянеры на другім, за прадпрымальнікамі, месцы, бо на адну асобу ў сярэднім выпадае 800 зл. прыбытку. А дзе ж асталіся пенсіянеры, якія атрымліваюць па 400-500 зл. пенсіі ў месяц, якім цяжка даводзіцца ў жыцці. Усім вядома, што пенсіянеры — людзі ў пажылых гадах, здароўе маюць слабенькае і многія з іх палову сваёй пенсіі аддаюць на лякарствы. Другая праўда такая, што маем у краіне багатых пенсіянераў, якія ў сіле здароўя адышлі на пенсію — гэта пенсіянеры мундзірных службаў, настаўнікі. Некаторыя арганізавалі прыватныя суполкі, шмат якія працуюць ахоўнікамі ў прадпрыемствах, атрымліваюць заслужаную пенсію ды зарплату і ім жывецца вельмі добра.

Цяпер пенсіянер-земляроб ледзь зводзіць канцы з канцамі, але што рабіць, жывым у зямлю не палезе, вымушаны жыць як прыходзіцца. Нашы ўлады, каб залатаць дзіру ў дзяржаўным бюджэце плануюць улезці ў партфель пенсіянера, бо ён не забастуе не маючы аніякай падтрымкі.

Мікалай Лук'янюк

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, адкрываем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Мужчына пільна шукае працу, III група інваліднасці, тэл. 0604 671 311.

• Маладая жанчына шукае працу ў Беластоку, музычная адукацыя, добрае веданне англійскай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0505 539 228.

• Студэнтка шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602 769 109.

• Абітурыент механічнага тэхнікума шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, тэл. 662 42 57.

• Малады мужчына (26 г.), працоўны стаж у тэхнічным магазіне, санітарны мінімум, уласная машына, правы кат. В, тэл. 662 07 88.

• Жанчына, вышэйшая эканамічная адукацыя, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 661 38 78.

• Студэнт шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, уласная машына, абслуга камп'ютэра, аператыўны (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0606 431 022.

• Спраўны мужчына шукае працу на тры дні ў тыдзень (па пятніцах, суботах, нядзелях), тэл. 0696 398 143.

• Бармен, санітарны мінімум, кніжка здароўя, праца толькі ў Беластоку (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602 318 086.

• Студэнтка (23 г.) ахвотна заапякуецца малым дзіцём у Беластоку ў ранніх гадзінах (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 744 52 93.

• Выканаю за невялікай аплатай добрыя пераклады з рускай мовы, тэл. 0601 421 871.

• Студэнтка маркетынгу шукае працу ў Беластоку, стаж працы ў магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра, арганізацыйныя здольнасці, добры падыход да дзяцей (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0692 687 442.

• Мужчына (24 г.), абслуга камп'ютэра, практыка ў сталярні, на будове, возьме любую працу, тэл. 868 19 11.

• Жанчына шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, веданне рускай і англійскай моў, санітарны мінімум, кніжка здароўя, шмат часу, тэл. 662 70 36.

• Маладая жанчына танна і дакладна прыбярэ кватэру, зварыць (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 651 18 35.

• Заапякуюся хворай, старэйшай асобай або дзіцём, прыбяру, тэл. 0508 820 414.

• Маладая жанчына, вопыт у гандлі, правы кат. В, адказная і сумленная (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0600 443 940.

• Мужчына, сярэдняя адукацыя, абслуга камп'ютэра, уласная машына, тэл. 0508 628 196.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 730 20 06

• Сям'я патрабуе мэблі, пасцелі і адзення для дзяцей ва ўзросце 4, 7 і 9 гадоў.

• Адзінокая маці, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і для 15-гадовай дачкі, а таксама пледаў і пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае пяцёра дзяцей, будзе ўдзячная за дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

• Самотная маці з дума сынамі ва ўзросце 10 і 13 гадоў, якая пасля смерці мужа апынулася ў трагічным становішчы, прыме любую дапамогу дзеля стварэння нармальных умоў існавання, прыдасца старая мэбля, халадзільнік, тэлевізар.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я без сродкаў да жыцця патрабуе адзення і абутку для дзяцей, а таксама пасцелі.

• Сям'я патрабуе пледаў, пасцелі і цёплага адзення для дзяцей (6, 9, 12 і 14 гадоў).

• Старэйшыя, хворыя людзі патрабуюць асобы, якая бясплатна дапаможа ў хатніх працах.

• Сям'я будзе ўдзячна за адзенне для сыноў ва ўзросце 5 і 6 гадоў.

• Шасціасабовая сям'я, без сродкаў да жыцця, патрабуе пасцелі, цёплага адзення і абутку для дзяцей.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, ахвотна аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 7304000.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 7454484.

• Аддам тапчан-полку з шафай, тэл. 6518020.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Абвесткі

Рэдакцыя „Wieści Podlaskich" запрашае на III Прэзентацыю „Вучэльні ў павеце":

— 2.04, гадз. 11 — у Комплексе прафесійных школ № 4 у Бельску,

— 3.04, гадз. 11 — у актавым зале Палітэхнікі ў Гайнаўцы, вул. Пілсудскага, 8.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2004 r. upływa 5 czerwca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Сідару Макацёру падказваю

Сідар, Сідар Макацёр:
Ты на печы штаны дзёр,
Як быў холад на дварэ.
Квас змагаўся за свае!

Не чапай ты ўладу нашу,
Бо наробіш амбарасу.
Яўген Чыквін, Сяргей Плева —
Ужо людзі ім не вераць.

Яны тады пра нас дбаюць,
Як іх людзі выбіраюць
А на Вейскай у крэсла сядуць —
То тады пра нас забудуць.

Тое трэба, Сідар, знаці:
Каб больш уладу не чапаці.
Хай бяруцца за лабы,
Абарвуць сабе чубы.

А як юшка пацячэ,
Квас і з Вейскай уцячэ.
І тады вясёлы Лепэр
Усім пакажа сваю крэпу.

Ну і Мядзведзь, хоць касалапы,
Пагражае сваёй лапай.
Я калісь рабіў парадак
Цяпер адышоў дазаду.

Не магу ўжо ніц сказаці.
Мусяць усе аб тым знаці.
Быў і ў мяне амбарас.
Цяпер дуля для ўсіх нас.

Маршал злева, маршал справа
А ў іх руках — булава.
Можа ёй па лобе даці,
Усім нам мазгі расхвастаці.

Мікалай Лук'янюк

„Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

У час пісьмовага экзамену адзін са студэнтаў пытае прафесара:

— Ці ў зале можна адчыніць акно? Вельмі душна...

— Калі ласка! Тут няма арлоў, ніхто не вылеціць...

Пасля экзамену студэнты выходзяць з залы, а той, што прасіў адчыніць акно, спыніўся каля дзвярэй, і калі прафесар выйшаў, здзівіўся:

— Дык і пан прафесар таксама дзвярмі?

* * *

Прафесар дакарае студэнта:

— Што? У мінулым тыдні вы прасілі мяне звольніць вас з лекцыі на паховіны вашага дзедкі, а сёння збіраецеся на яго радзіны?

— Бо мой дзедка ўжо такі стары, што паблыталіся яму ўсе даты.

* * *

Варшаўскі студэнт Янка напісаў бацьку ліст, каб прыслаць яму грошы. Праз некалькі дзён Янка адбірае на пошце 50 злотаў, а на паштовым пераводзе дапіску: „Пасылаю табе грошы, якія ты ў мяне прасіў ды звяртаю ўвагу, што «50» пішацца з адным нулём, а не з трыма".

* * *

— Чаму лянівыя людзі не працуюць?

— Бо пасля ежы, піцця і сну не астаецца ім часу на ўсё апошняе.

* * *

Янка прыходзіць да лекара:

— Доктар, маю клопат з хадой...

— А як гэта праяўляецца?

— Мінае ўжо дзесяць гадоў як закончыў вучылішча і яшчэ да нічога не дайшоў.

У чаканні Вялікадня

Мал. АЛЕГА КАРПОВІЧА

Музычныя навіны

Малады, надзейны гурт „IQ 48" (вядомы з гіту „Клён"), які заваяваў адну з узнагародаў Басовішча-2003, ужо без Фрэйда. Фрэйд — адзін з заснавальнікаў і вакалістаў гурту — аб'явіў, што рыхтуе новы „фолк-рэп" праект пад назовам „Пан Жыжма". Як кажа Фрэйд, «з часам мне захацелася рабіць зусім іншую музыку. У межах „IQ 48" было гэта немагчымае, а мяшаць не хацелася. З хлопцамі адносіны застаюцца сяброўскія, напэўна будзем супрацоўнічаць». Шкада з аднаго боку, з другога, можа з гэтага атрымаюцца два добрыя гурты. Чакаем.

„Крамбамбуля III" — як інфармуюць крыніцы, чакае нас вялікая неспадзяванка. Супольна з беларускімі зоркамі (Лявон Вольскі, Алесь Кулінковіч, Сярожа Міхалок) працаваць будуць славутыя ўкраінскія „Воплі Відоплясова". Калі засіміляваць творчасць усіх, тады атрымаецца касмічная мяшанка несамавітых эмоцый. Што атрымаецца ў сапраўднасці? Пажывем, пачуем. Мабыць, будуць гэта песні НАРОДАЎ СВЕТУ — турэцкія, кітайскія і іншых арабскіх.

PS. „Крамбамбуля" шукае дзявочага голасу ! Заявы дасылайце па э-майлу: konkurs@krambambulya.com

У Беларусі больш за год у радыёэфіры, паводле законаў, больш за 50% музыкі павінна быць беларускай. Так яно і ёсць, але музыка, якую чуюць слухачы, даволі „касмічная", да таго расійскамоўная. Вось таму MI VOKA і BMAgroup пачалі кампанію „ШТУРМ ФМ", мэтай якой з'яўляецца „павелічэнне колькасці беларускамоўных песень у эфіры радыёстанцыяў". Арганізатары рашаюць, у які дзень і гадзіне штурмаваць FM станцыі. Штурм — гэта тэлефанаванне на „радыё" дзеля перадавання прывітанняў і заказвання беларускамоўных песень. Жадаем поспеху! Info: www.voka.by.ru

Адгаданка

Шыфраграма



Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Бертрана Расела.

1. малады бык =
1 __ 20 __ 19 __ 25 __ 36 __;
2. высокае і вузкае архітэктурнае збудаванне =
10 __ 11 __ 39 __ 9 __;
3. актывіст =
32 __ 30 __ 35 __ 14 __ 6 __;
4. напой прыгатаваны з молатых зярнят кафейнага дрэва =
12 __ 13 __ 17 __ 31 __;
5. брат Авеля =
40 __ 34 __ 16 __ 33 __;
6. паўночнанямецкі горад у ... кільватэры =
28 __ 29 __ 26 __ 27 __;
7. невялікі драпежны звярок сямейства куніцавых = 15 __
18 __ 37 __ 38 __ 22 __ 2 __;
8. музычны твор, які складаецца з некалькіх рознахарактарных п'ес аб'яднаных адзінствам задумы =
4 __ 3 __ 41 __ 24 __ 23 __;
9. дванаццатая частка фута, роўная 2,54 см. =
21 __ 7 __ 8 __ 5 __;

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 8 нумара

У Буша шубу.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

4.04 – 10.04

Баран (21.03. — 19.04.) Добры час на падарожжы, любоўныя сустрэчы. Добра ўсё плануй, будзь уважлівы, не забывай аб тэрмінах. Не шкадуй сабе дробных прыемнасцей.

Бык (20.04. — 20.05.) 8 — 10.04. не дамаўляйся на ніякія важныя сустрэчы і не рызыкуй у фінансавых справах. Чакае цябе файная забава. Калі штосьці табе муляе ў сувязях, выкажаш прэтэнзіі. 7 — 11.04. можаш мець часовыя праблемы з сяброўкамі. 9.04. не дайся падмовіць на ніякія „залатыя інтарэсы". Калі штосьці шванкуе з тваім арганізмам, 5 красавіка будзеш ужо ведаць.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Венера настроіць цябе рамантычна і дасць нагоду для сустрэчаў з мараў. Не раскідайся грашыма, увесь месяц трымайся за кішэнь! Любоўныя страсці падпаліць каля 5.04. поўня Месяца ў знаку Шаляў. Каля 6.04. могуць выбухнуць скрываныя канфлікты. Чакай напасці вірусаў 6 — 8.04. Не дайся!

Рак (22.06. — 22.07.) Найбольш будуць цікавіць цябе твае фінансы. Будзеш канцэнтравацца на матэрыяльным забеспячэнні. Поўня Шаляў у знаку Шаляў 5.04. дазволіць пабачыць табе хатнія справы ў іншым святле.

Леў (23.07. — 22.08. Сексцыль Сонца да Нептуна пабудзіць тваю фантазію, 2 — 6.04. асабліва моцна падтрымліваць ён будзе ўсе творчыя і мастацкія дзеянні. Паміж 9 — 11.04. можаш быць сканцэнтраваны на ўласным эга, не будзеш лічыцца з патрэбамі іншых. Сваім эгаізмам можаш справакаваць прыкрыя сітуацыі. Сямейныя справы ахопяць цябе 6 — 8.04. Жанчына блісне красой і прывабнасцю. З сябрамі пагуляеш і заробіш грошы.

Дзева (23.08. — 22.09.) За павышэнне мусіш змагацца сама. 8 — 10.04. рыхтуецца востры канфлікт, а найбольш адчуюць яго Дзевы народжаныя паміж 27 і 31.08. Дбай аб свае вочы.

Шалі (23.09. — 23.10.) Можаш шмат дасягнуць, калі ў час поўні Месяца 5.04. рашышся на сур'ёзныя крокі, каб ратаваць найважнейшае. Хтось паможа табе ў кар'еры. Будзеш шчаслівым. 9.04., у квадратуру Венеры з Уранам, будзеш залішне нервовы, не памыліся ў грашах.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) У любові вясновы зрух і шанц на рамантычнае знаёмства. Выдаткі і інвестыцыі адкладзі. Задбай аб сваю красу найбольш 6 — 8.04. Калі нарадзіўся ты 5 — 10.11., чакай у сваім жыцці немалога закалоту. Непатрэбная рызыка (асабліва пад канец месяца — рыхтуйся ды мацуйся!).

Стралец (22.11. — 21.12.) 4 — 8.04. пазбягай рызыканцкіх мерапрыемстваў. Можаш быць нецярплівы і раздражнены. Ужо з 3.04. адносіны ў тваіх сувязях найлепшыя, якія толькі могуць быць.

Казярог (22.12. — 20.01.) Новыя знаёмствы, планы на будучыню. Можаш парваць са шкоднымі звычкамі. Увесь красавік — ідэальны час на заручыны, прызнанні.

Вадалей (21.01. — 19.02.) У час поўні Месяца 5.04. трапяцца табе геніяльныя ідэі. Няма для цябе неразгаданых спраў! 7 — 10.04. не абяцай сабе замнога па новым знаёмстве. 9.04. — крыху расчараванняў у пачуццях. Нервам патрэбны адпачынак. Хтосьці са старых сяброў (Вадалей, Рак) захоча аднавіць знаёмства.

Рыбы (20.02. — 20.03.) Лягчэй пераканаеш асяроддзе да тваіх ідэй 2 — 8 красавіка. Нават вялікія мроі могуць здзейсніцца. Дома трэба бываць часцей, а есці рэгулярна.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960